Міжнародны штаб сацыял-фашызму і здрады
ВЫРАКАЕЦЦА СВАІХ АГЕНТАЎ

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 63 (3967)
ПЯТНІЦА, 6 САКАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Пад напорам зусім неабвяржымых фактаў самі падсудныя выкрываюць сьмеху вартыя „абвяржэньні" Абрамовічаў

II Інтэрнацыяналу ня ўдасца замесьці сьлядоў

Бальшавіцкі плян калгаснай вясны павінен быць выканан

Учора скончылася дэкада праверкі падрыхтоўкі да сяўбы, абвешчаная ЦК КП(б)Б. Адсутнасьць справаздач раёнаў не дае яшчэ сёньня магчымасьці поўнасьцю падагуліць рэзультаты дзесяцідзейніка агляду падрыхтаванасьці да другой бальшавіцкай сяўбы. Аднак, шматлікія матар'ялы нашых брыгадзіраў, селькораў і, нарэшце, зводка НКЗ за час з 20 лютага па 1 сакавіка, якая адлюстроўвае работу за першую палову дэкады праверкі, дазваляюць падвесьці некаторыя папярэднія вынікі.

«Зьвязда» на працягу дэкады два разы сыгналізавала, што значная частка раённых арганізацый і газэт недаацэньваюць вялізарнага палітычнага значэньня праверкі і яе грандыёзнай ролі ў разгортваньні калгаснага руху і ўдарнага завяршэньня асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сяўбы. Нашы сыгналы аказаліся правільнымі. Рад мясцовых арганізацый ня прынялі належных мер, каб арганізаваць сапраўды мясавы агляд падрыхтоўкі да вясны, сапраўдны штурм прарываў. Шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў ня былі прыцягнуты да непасрэднага ўдзелу ў праверцы, што нельга інакш вытлумачыць, як правааапартуністычнай недаацэнкай мабілізацыі мас на барацьбу за калгасную сяўбу, на барацьбу з кулаком, правааапартуністычным самацёкам і «лявацкімі» перагібамі.

Праўда, у многіх раёнах на праверку былі накіраваны шматлікія брыгады з раённага партыйнага, камсамольскага і прафесыянальнага актыву, мабілізаваны дэлегаты раённых зьездаў калгасаў, але далёка ня ўсюды гэта дало чаканы эфэкт.

Прычыны ў тым, што людзі ня былі ў належнай меры праінструктаваны, што праверка была адарвана ад задач неадкладнай энэргічнай ліквідацыі выяўленых прарываў.

Бясспрэчка, што вялікі адмоўны ўплыў зрабіла адсутнасьць належнага жывога кіраўніцтва работай праверачных брыгад з боку раённых штабаў. Адзначана шмат выпадкаў нерацыянальнага скарыстоўваньня кінутых у вёску людзей. Нельга таксама прайсьці міма фактаў неправільных дзеяньняў брыгадзіраў, якія адыгрывалі ролю рэвізораў-чыноўнікаў і дэзарганізоўвалі работу, а не дапамагалі ў выяўленьні і ўдарнай ліквідацыі недахопаў пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных арганізацый.

Такім чынам, дрэнная арганізацыя праверкі (а часта проста яе неарганізаванасьць) значна зьнізіла эфэктыўнасьць дэкады ў радзе раёнаў.

У сьвятле ўсяго гэтага становіцца зразумелым адсутнасьць зруху ў рабоце па калектывізацыі і падрыхтоўцы да сяўбы за мінулую дэкаду па БССР у цэлым. Неабходна канстатаваць з усёй яснасьцю, што катэгарычныя дырэктывы ЦК КП(б)Б аб неадкладным разгортваньні сапраўды ўдарнай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай сяўбы і работы па калектывізацыі ня выкананы. Ударных, бальшавіцкіх тэмпаў падрыхтоўкі ўсё яшчэ не адчуваецца.

На 1 сакавіка процант калектывізацыі павысіўся да 18,1. За дэкаду калектывізавана 4.533 гаспадаркі (0.6 проц.) супроць 5.171 гаспадаркі (0,7 проц.) за папярэднюю дзесяцідзённую. 13 раёнаў паведамілі, што за апошнюю дэкаду ў іх зусім ня было прыліву ў калгасы.

Такім чынам, у наяўнасьці нават некаторае зьніжэньне тэмпу. Праўда, калі ўзяць люты ў цэлым (было калектывізавана 2.1 проц. гаспадарак), дык ёсьць павялічэньне амаль у два разы супроць студзеня (было калектывізавана 1,1 проц.). Але і лютаўскія тэмпы ні ў якім выпадку не забясьпечваюць нам вы'кананьня дырэктывы партыі аб калектывізацыі 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да вясны. Арганізацыя нарастаючага прыліву абсалютна нездавальняючая.

Аб прычынах яскрава гавораць матар'ялы праверкі і адносіны некаторых раёнаў да арганізацыі самой дэкады праверкі. Прычыны — правааапартуністычная стаўка на самацёк і бязьдзейнасьць, недаацэнка сыстэматычнай масавай работы і мабілізацыі мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў на барацьбу з кулаком. Праверка выявіла абураючыя адносіны ў некаторых раёнах да пытаньняў разьвіцьця і замацаваньня калгаснага руху, як напрыклад, неафармленьне калгасаў на працягу некалькіх тыдняў (Мсьціслаўскі раён), абсалютную адсутнасьць кіраўніцтва ініцыятыўнымі групамі і г. д.

Такі-ж малюнак і з выкананьнем асноўных вытворчых мерапрыемстваў да веснавой сяўбы. Даныя на 1 сакавіка мала чым адрозьніваюцца ад ганебных паказальнікаў мінулай дзесяцідзённі. Так, заданьне аб ссыпцы насенных фондаў у калгасах выканана ўсяго НА 38,3 ПРОЦ. СУПРОЦЬ 32 ПРОЦ. НА 20 ЛЮТАГА, А ПА СТРАХАВЫХ ФОНДАХ — НА 23,5 ПРОЦ. СУПРОЦЬ 19,2 ПРОЦ. ПЛЯН ЗБОЖЖААЧЫСТКІ ВЫКАНАН НА 56,6 ПРОЦ. (СУПРОЦЬ 51,4 ПРОЦ. НА 20 ЛЮТАГА) ПА КАЛГАСАХ І НА 16 ПРОЦ. (СУПРОЦЬ 12,5 ПРОЦ.) ПА ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ. Толькі да 61,9 проц. калгасаў і 34,9 проц. аднаасобнікаў даведзены пасеўныя пляны. Ремонт трактараў выкананы недзь на 48 проц.

Прычыны — тыя-ж: махровая правааапартуністычная практыка, адсутнасьць жывога кіраўніцтва з боку раду раённых арганізацый, недаацэнка масавай работы. Праверка цэнтральных сельска-гаспадарчых арганізацый паказала, што адзначаныя вялізарныя прарывы ў значнай ступені зьяўляюцца рэзультатам нездавальняючай пастаноўкі работы апаратаў асноўных пасеўных штабаў — Наркамзему, калгасна-каапэрацыйных цэнтраў. Праверка работы пасеўных штабаў паказала, напрыклад, такі абураючы факт, як нескладаньне да гэтага часу пляну забесьпячэньня пасеўных плошчаў насеньнем, бязьдзейнасьць у галіне рэалізацыі адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі, гэтай разгорнутай праграмы сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы.

Дэкада праверкі выявіла буйнейшы недахоп у ходзе падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны, недахоп, які асабліва рэзка стаў выпукляцца за апошні час. Гутарка ідзе аб тым, што ў значнай колькасьці раёнаў РАБОТА ПА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ АРГАНІЧНА НЯ ЎВЯЗВАЕЦЦА З АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ ГАЛОЎНЕЙШЫХ ВЫТВОРЧЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ І З КАНТРАКТАЦЫЯЙ. Наглядаецца пэўнае неразуменьне таго, што, напрыклад, без насеньня калгас да сяўбы прыступіць ня зможа, што аднаасобна са сваёй арганізацыяй калгас зьмен неадкладна забясьпечыць патрэбнымі сродкамі вытворчасьці, што вытворчых мерапрыемстваў ад калектывізацыі можа пастаўіць калгасны сэктар у цяжкае становішча ў пэрыяд сяўбы. 38,3 проц. насенных фондаў на сёньняшні дзень — гэта пагроза калгаснай сяўбе і намечанаму пляну пашырэньня пасеўнай плошчы.

Было-б вялізарнай палітычнай памылкай лічыць, што дэкада праверкі нічога станоўчага не дала. Наадварот, факты гавораць, што тыя раёны, ЯКІЯ ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЛІ ПРАВЕРКУ І ЗРАЗУМЕЛІ ЯЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ, ДАСЯГНУЛІ ВЯЛІКІХ РЭЗУЛЬТАТАЎ, ПАКАЗАЎШЫ, ШТО САПРАЎДНАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС НА БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ, СА СКАЖЭНЬНЯМІ ЛІНІІ ПАРТЫІ, НА БАРАЦЬБУ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ВАЖНЕЙШЫХ ДЫРЭКТЫЎ МОЖНА ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАЎ. Даволі адзначыць, што ўжо на 1 сакавіка 11 РАЁНАЎ БССР ВЫКАНАЛІ, А ЧАСТКА З ІХ ПЕРАВЫКАНАЛА, ПЛЯН КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ 30 ПРОЦ. БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ДВАРОЎ ДА ВЯСНЫ. Разгортваючы СТАЛІНСКІ ПРЫЗЫЎ У КАЛГАСЫ, КОЙДАНАЎСКІ раён за апошнюю дэкаду ўцягнуў у калектывы 756 гаспадарак (процант калектывізацыі ўзрос з 26,3 да 36,7), МАГІЛЕЎСКІ—349 гаспадарак, КАСЬЦЮКОВІЦКІ — 336, СУРАСКІ—260 гаспадарак і г. д.

На працягу апошняй дэкады рад калгасаў поўнасьцю скончылі падрыхтоўку да сяўбы. У падарунак Усесаюзнаму зьезду саветаў калгас «ГІГАНТ» (Баярскі сельсавет, Полацкага раёну) АЖЫЦЬЦЁВІЎ УСЕ ВЫТВОРЧЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДА ВЯСНЫ І АРГАНІЗАВАЎ ПРОБНЫ ВЫЕЗД У ПОЛЕ. Выезд паказаў поўную падрыхтаванасьць гэтага калгасу да веснавой сяўбы. Ударная падрыхтоўка калгасьнікаў выклікала прыліў аднаасобнікаў у гэту арцель.

Гэтыя факты—магутны ўдар па агентах імпэрыялістаў, па контр-рэвалюцыянэрах-меншавіках, па Абрамовічах, Данах, Суханавых, якія рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР; моцны ўдар па агентах кулака—апартуністах, якія прабуюць сарваць выкананьне і перавыкананьне намечаных партыяй тэмпаў сацыялістычнага наступленьня.

Ажыцьцяўленьне разгорнутай праграмы бальшавіцкай сяўбы ўступае зараз у найбольш адказны пэрыяд канчатковага завяршэньня ўсіх падрыхтоўчых работ да калгаснай вясны. Ажыцьцявіць праграму сацыялістычнага наступленьня нямыслімa бяз поўнага выкананьня дырэктыў аб загатоўках і аб кантрактацыі. Толькі арганічная ўвязка ўсіх гэтых мерапрыемстваў і сапраўды бальшавіцкае ўдарнае іх выкананьне, толькі самая рашучая барацьба з правааапартуністычным самацёкам і «лявацкім» адміністраваньнем забясьпечыць нам пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны, ажыцьцяўленьне лёзунгу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як класы.

Дэкада праверкі была толькі пачаткам сапраўды масавага паходу за бальшавіцкую вясну. Рад раёнаў ня здолелі арганізаваць гэты паход. Але вопыт лепшых раёнаў паказвае, што шляхам прыцягненьня да барацьбы за выкананьне дырэктыў партыі шырокіх мас можна дасягнуць вялізарных рэзультатаў. Гэты вопыт трэба зараз, пасьля дэкады, пашырыць на адстаючыя раёны. Арганізаваць у сябе самаправерку, правесьці яе па-бальшавіцку, выкрыць усе свае вузкія месцы, ТУТ-ЖА НА ХАДУ ЛІКВІДАВАЦЬ ВЫЯЎЛЕНЫЯ ПРАРЫВЫ,—такая задача тых раённых арганізацый, якія ня здолелі, як належыць, правесьці дэкаду праверкі.

Час не чакае. Вясна набліжаецца. Дорага кожная гадзіна, кожная мінута. Бальшавіцкія тэмпы павінны быць узяты. Адставаньне больш нецярпіма.

Плян бальшавіцкай падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны можна выканаць, трэба і ён будзе выканан.

„Тэзісы т. Якаўлева зробім вострай зброяй у бальшавіцкай барацьбе

за ўдарную сустрэчу другой калгаснай вясны, за магутны ўздым калгаснай хвалі, за рэалізацыю адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі"

ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ МЕНСКАГА ПРЫГАРАДНАГА РАЁНУ з удзелам прадстаўнікоў аднаасобнікаў абвясьціў сябе ўдарным па папулярызацыі тэзісаў і выклікаў пасьледаваць яго прыкладу ўсе калгасы і МТС БССР

Калгасьнікі і аднаасобнікі—беднякі і сераднякі Менскага прыгараднага раёну, сабраўшыся на першы раённы зьезд калгасаў абгаварыць шляхі і задачы далейшай барацьбы за справу суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як класы, на гэтай аснове,—**шлюць гарачае калгаснае прывітаньне 6-му Ўсесаюзнаму зьезду саветаў краіны дыктатуры пралетарыяту.**

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі мы, калгасьнікі Менскага раёну БССР, **наперакор жорсткаму супраціўленьню кулацтва і спробам яго агентуры правых і «левых» апартуністаў**—затармазіць пераможны калгасны рух,—**з посьпехам ажыцьцяўляем сацыялістычную рэканструкцыю вёскі** і цьвёрда ідзем усё наперад і наперад па шляху арганізацыі буйных абагуленых спэцыялізаваных гаспадарак, выконваючы ўказаньні XVI зьезду партыі і паступовых пленумаў ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Мы мабілізуем усе свае сілы, усю сваю энэргію па справу будаўніцтва малочна-жывёлагадоўчых і садова-гародных калгасаў, **ажыцьцяўляючы гэтым самым задачу—абкружыць пралетарскія цэнтры колам спэцыялізаваных сацыялістычных гаспадарак.**

У агні бязьлітаснай барацьбы з кулаком нашы калгасы вырасьлі і ўзмацніліся, цьвёрда стаўшы абедзьвюма нагамі **на шлях далейшага** пераможнага росту. Да Ўсесаюзнага зьезду саветаў **мы дабіліся калектывізацыі да 40 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак нашага раёну. У другую бальшавіцкую вясну ня менш 60 проц. усіх гаспадарак будзе ў калгасах.** Аб гэтым яскрава сьведчыць усё ўзрастаючы прыліў у калгасы нашага раёну. **Пасеўная плошча ў калгасах узрасла на 49 проц. Увесну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі яна дасягне ня менш 67 проц.** Гэтыя посьпехі даюць нам цьвёрдую ўпэўненасьць, што ўжо ў другую калгасную весну мы створым харчовую базу для забесьпячэньня пралетараў і працоўных сталіцы Савецкай Беларусі—Менску.

Абгаварыўшы тэзісы дакладу тав. Якаўлева, наш раённы зьезд калгасаў, разам з прадстаўнікамі аднаасобных бядняцка-сераднякіх мас, адзначае вялізарнейшае значэньне тэзісаў для справы разгорнутага сацыялізму, для барацьбы за новы магутны ўздым калгаснага руху, за суцэльную калектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва, як клясы. Аднадушна далучаючыся да тэзісаў дакладу тав. Якаўлева Ўсесаюзнаму зьезду саветаў, мы зробім іх нашай вярнейшай і вострай зброяй у справе разгорнутай бальшавіцкай барацьбы за ўдарную сустрэчу другой калгаснай сяўбы, за магутны ўздым калгаснай хвалі, за рэалізацыю адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі.

Мы абавязваемся шырока папулярызаваць тэзісы, прасунуць іх у масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, **азнаёміць з імі кожнага калгасьніка і кожнага бедняка і серадняка,** сёньня яшчэ ня ўступіўшага ў калгас. Для гэтага **мы абвяшчаем сябе, усе, як адзін, ударнікамі па папулярызацыі тэзісаў і выкананьні ўсіх задач, пастаўленых у іх, выклікаючы пасьледаваць нашаму прыкладу ўсе калгасы і камуны, усе МСТ Савецкай Беларусі і ўсяго СССР.**

У адказ на паклёпы і агідную хлусьню правакатараў імпэрыялізму і падпальшчыкаў новай вайны аб «прымусовай працы» у Савецкім Саюзе, **у адказ на змову контр-рэвалюцыянэраў і шкоднікаў-меншавікоў, якія рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам сацыял-фашысцкай банды II Інтэрнацыяналу, мы шырока разгорнем ударніцтва ва ўсіх калгасах,** узьнімем працу калгасьніка на вышыню высока арганізаванай сацыялістычнай працы і забясьпечым сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў выкананьні задач другой бальшавіцкай вясны і арганізуем магутны сталінскі прыліў у калгасы.

Няхай жыве суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як клясы, на гэтай аснове!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Раённы зьезд калгасаў Менскага прыгараднага раёну.

Блёк на пляцформе шкодніцтва і інтэрвэнцыі

СПРАВА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНШАВІКОЎ

МАСКВА, 4. Ранішняе пасяджэньне адкрылася высьвятленьнем з боку абароны ролі Фін-Енатаеўскага ў «саюзным бюро» меншавікоў. Абаронца — тав. Камодаў радам пытаньняў арабаваў ставыць уражаньне, што Фін-Енатаеўскі ў меншавікоў быў толькі ідэолягам, а не практычным правадніком контр-рэвалюцыйнай работы. Аднак, пасьля раду пытаньняў тав. Крыленкі, падсудны Фін-Енатаеўскі па сутнасьці пацьвердзіў свой поўны ўдзел у контр-рэвалюцыйнай нелегальнай рабоце меншавікоў, спасылаючыся, аднак, на тое, што аб характары гэтай работы ён поўна даведаўся.

ПАКАЗАНЬНІ СЬВЕДКІ КАНДРАЦЬЦЕВА

На пытаньні тав. Крыленкі сьведка Кандрацьцеў паведамляе, што ён быў асабіста знаёмы аб нелегальнай меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі са спатканьняў з Громанам, Суханавым, Сакалоўскім і інш. Пачынаючы з 1927 году і асабліва ў першай палове 1928 г., паводле слоў Кандрацьцева, кулацкая група, на чале якой ён стаяў, знаходзілася на пазыцыях гэтай меншавіцкай контр - рэвалюцыйнай арганізацыі і яе «саюзнага бюро» і мела яе агульную ўстаноўку, якая заключалася ў тым, што краіна з-за повага курсу савецкай улады, разгорнутага наступленьня сацыялізму — знаходзіцца ў стане эканамічнага і палітычнага крызісу, што гэты крызіс прыводзе да палітычнай катастрофы. Устаноўка ТКП і меншавікоў супадалі ня толькі ў праграмных пытаньнях, але і ў пытаньнях тактычных. Абедзьвюма контр-рэвалюцыйнымі арганізацыямі падтрымліваўся правы ўхіл і надзеі на раскол кампартыі. Абедзьве лічылі неабходным ужываньне шкодніцтва над лёзунгам — «чым горш, тым лепей». Абедзьве прызналі набходнасьць арганізацыі сялянскіх паўстаньняў і падрыхтоўку інтэрвэнцыі. Гэта была ўстаноўка,—прызнае Кандрацьцеў, — на аднаўленьне капіталізму.

Далей Кандрацьцеў указвае, што імі была створана кантактная камісія, якая аб'ядная меншавікоў у яго групу.

Падсудным Громан, Суханаў, Шэр, і Фін-Енатаеўскі, пацьвердзілі паказаньні Кандрацьцева.

Затым Кандрацьцеў адносна сваёй контр-рэвалюцыйнай работы дае яшчэ наступныя ўказаньні: «Тавар і зараз тут я лічу магчымым і неабходным сказаць, што я прымаў удзел актыўны, нават кіруючы, у контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці, кіруючыся ідэйна-палітычнымі меркаваньнямі. Агучыць сапраўдны мае палітычныя погляды я мог бы характарызаваць, як сапраўдны рэфармізму, сацыяльнага рэфармізму эвалюцыянэрскі, наступовасьці. Я быў прыхільнікам высокіх тэмпаў індустрыялізацыі, у асабістасьці ня ніжэй індустрыі, і быў прыхільнікам вельмі далёка ідучых рэвалюцыйных мерапрыемстваў у галіне народнай гаспадаркі наогул. Але пакуль у нас быў НЭП першай фармацыі, г. зн., у перыяд з 1921 пачаўшы 1926 году, мяжчы гэту рэфармісцкую ўстаноўку, я не адчуваў для сябе немагчымым актыўна і станоўча супрацоўнічаць з савецкай уладаю, я і супрацоўнічаў у гэты перыяд. Але калі пачалося сацыялістычнае наступленьне, калі я бачыў як гэта сацыялістычнае наступленьне суправаджаецца абастрэньнем эканамічных труднасьцяй і клясавых супярэчнасьцяй, я зрабіў вывад, што я абавязан супрацьдзейнічаць новаму парадку. Гэта супрацьдзейнічаньне пачалася і пачалася на сутнасьці з легальнай апазыцыі.

Але ўсякая палітычная барацьба мае сваю лёгіку і, пачаўшы з легальнай апазыцыі, гэта барацьба прывяла мяне паступова і да розных форм нелегальнай і злачынай барацьбы, якая вось тут даволі рэльефна была выяўлена, аж да ўстановак, нарэшце, шкодніцкага характару, аж да прызначэньня ў тэй ці іншай форме неабходнасьці выкарыстаньня інтэрвэнцыі. Зараз у выніку сумненьняў, якія зараджаліся ў пачатку 1930 году, выніку шматлікіх аналізаў, зробленых зусім вольна, я прышоў да наступных высноў.

Я на толькі лічу памылковымі мае тэарытычныя, ідэалёгічныя ўстаноўкі, але у той-жа самы час лічу злачынай і маю практычную дзейнасьць, накіраваную на барацьбу з савецкай уладай, на барацьбу з будаўніцтвам СССР. Я прасіў-бы даволу ўказаць на тыя асновы, якія прывялі мяне да такога роду пераадзеньні каштоўнасьці. Я вельмі добра ведаю, што тая хваля калектывізацыі, якая мела месца, суправаджалася вялізарнейшымі труднасьцямі, тым ня менш зьдзіўляючым для мяне зьяўлецца тое, што ў выніку ўсіх тэзіс затрудненьняў мы маем настолькі высокую норму ўжо перайшоўшых на калектыўныя асновы індывідуальных гаспадарак, што інакш, як зьменай арыентацыі сялянства ў яго адносінах да праграмы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, я гэта назваць не магу.

Другая акалічнасьць заключаецца ў зусім нязвычайных посьпехах індустрыялізацыі краіны. Я ведаю і аб'ектыўна бясспрэчным застаецца той факт, што Савецкі Саюз арганізаваў такія тэмпы разьвіцьця індустрыі і такія тэмпы накапленьня ў краіне, якіх сьвет ніколі ня бачыў. Я лічу, па сумленнасьці, абавязкам кожнага грамадзяніна савецкай рэспублікі ня толькі сумленна, але і зусім актыўна садзейнічаць шпаркаму, найбольш пасьпяховаму ажыцьцяўленьню задач, якія высоўваюцца савецкай уладай. Але для тых, хто разам са мною актыўна змагаўся супроць гэтай лініі, папярэдні доўг заключаецца ў тым, каб сказаць зброю перш за ўсё. Вось, калі я думаю аб гэтай зброі, якой я, разам з другімі, і, магчыма, больш за другіх, змагаўся, дык мне прыходзіцца сказаць, што ў нашай прэсе і грамадзкай савецкай думцы гэта зброя атрымала ясную назву, назву «Кандрацьцеўшчыны». І вось я дазволю сабе сказаць, што лічу неабходным ня толькі для сабе, але і для тых, што разам са мною змагаліся названай зброяй, скласьці гэту зброю перш за ўсё, і ня толькі скласьці яе, але зруйнаваць, і зруйнаваць ня толькі яе, але і ўсе элементы сацыяльнай сапраўднасьці, якія могуць яшчэ дзейнічаць».

Допыт Кандрацьцева заканчваецца высьвятленьнем пытаньня аб сувязі меншавіцкай арганізацыі з контр-рэвалюцыйнымі партыямі.

СУВЯЗЬ З ЗАГРАНІЧНЫМ ЦЭНТРАМ

Пасьля допыту Кандрацьцева суд прыступіў да высьвятленьня пасобных моментаў гэй канкрэтнай сувязі, якія ажыцьцяўлялася паміж «саюзным бюро» і заграніччным цэнтрам меншавікоў. Першым з гэтага повагу падрабязнае тлумачэньне даў падсудны Шэр. Ён катэгарычна пацьвярджае, што ў СССР прыяжджалі два прадстаўнікі заграніччнага меншавіцкага цэнтру: Абрамовіч—у 1928 годзе і Брауштэйн—у 1929 г. Падсудны з падрабязнасьцямі, якія не пакідаюць ніякага сумненьня, малюе абстаноўку, пры якой адбылося яго спатканьне з Абрамовічам. З вычарпальнай паўнатой Шэр расказвае аб тым, як ён наладзіў спатканьне Абрамовіча з Гінзбургам (у Сакольніцкім гаі), а потым у сябе на кватэры з Залкіндам.

Ад яго Абрамовіч паехаў назад ужо не праз Брансклі, а, у мэтах канспірацыі, праз Аляксандраўскі вакзал. У гутарцы з падсудным Абрамовіч указваў неабгрунтаванасьць арганізацыі называцца ЦК РСДРП, а прапанаваў прысвоіць арганізацыі назву «саюзнага бюро» ЦК. Абрамовіч указваў, што ўсе надзеі на ўнутранае перараджэньне савецкай улады, на магчымы зварот да пазыцый першага этапу НЭП'у—правальваюцца. Таму ён пацьвердзіў рашучую неабходнасьць пераходу на шкодніцкую тактыку. Гэта тактыка зьяўлялася нямінучай прадпасылкай інтэрвэнцыі. Абрамовіч запэўніў членаў арганізацыі, што за апошні час у пытаньні аб інтэрвэнцыі ў кіруючых колах II інтэрнацыяналу і, у прыватнасьці, нямецкай сацыял-дэмакратыі адбыўся карэнны зрух. Гэтыя колы ня толькі прызналі нямінучасьць інтэрвэнцыі, але і прышлі да выводу аб яе пажаданасьці. Асновай для такога выводу паспужыла зразуменьне тэй яўнай небясьпекі, якую прадстаўляе сабой далейшае існаваньне савецкай улады для міжнароднай сацыял-дэмакратыі. Указвалася на тое, што работа Камінтэрну наносіць мацнейшы ўдар II Інтэрнацыяналу, які ўсё больш траціць свой аўтарытэт у вачох шырокіх рабочых мас. Савецкая ўлада павінна быць зьнішчана. Для дасягненьня гэтай мэты інтэрвэнцыя—найпэўнейшы сродак. Але-ж інтэрвэнцыя зьвязана з нязьлічанымі ахвярамі і небачанымі крывавымі жахамі. Для ачышчэньня сумленьня найбольш «сердабольных» меншавікоў і натхніцеляў інтэрвэнцыі на ўсякі выпадак мелася такая вэрсія: ёсьць магчымасьць уникнуць гэтых жахаў. Для гэтага трэба паставіць савецкую ўладу перад рэальнай пэрспэктывай інтэрвэнцыі. Тады можна будзе абмежавацца адным дыпляматычным націскам. Пад націскам неабходнасьці савецкая улада пойдзе на ўступкі капіталістычнаму рэжыму, што ў рэзультаце прывядзе толькі да далейшага разьвіцьця гэтай улады. Такія надзеі — узьлез савецкую ўладу шантажом, як сьцьвярджае падсудны Гінзбург,—выказваў у гутарцы з ім Абрамовіч.

II Інтэрнацыянал--натхніцель і арганізатар інтэрвэнцыі супроць СССР

Паказаньні падсуднага Залкінда

Першае спатканьне з Абрамовічам,—паказвае Залкінд, — адбылося ў 1928 г. на кватэры Шэра. Залкінд падрабязна інфармаваў Абрамовіча — аб харчовым становішчы СССР. Падсудны запэўніе, што яго інфармацыя «не задаволіла Абрамовіча». Абрамовіч жадаў атрымаць вестки аб надыходзячай катастрофе і значным пагоршаньні становішча рабочае клясы, а Залкінд яго «расхаладзіў». Між іншым, — як паказвае Залкінд,— Абрамовіч застаўся на сваёй пазыцыі ацэнкі эканамічнага становішча СССР, бо галоўнае ідэалёгічнае ўгрунтаваньне меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай работы са стаўкай на інтэрвэнцыю заключалася іменна ў «абароне» рабочых. Калі ў гутарцы было закранута пытаньне аб інтэрвэнцыі, дык Абрамовіч указаў Залкінду, што да інтэрвэнцыі заграніччная дэлегацыя адносіцца, як да неадхільнага факту. А для таго, каб забясьпечыць інтарэсы дэмакратыі ў інтэрвэнцыі, неабходна рабіць пэўныя намаганьні на яе падрыхтоўку. На прапанову Залкінда інфармаваць аб сучасных адносінах да інтэрвэнцыі Абрамовіч адказаў: «Вы наіўна разважаеце».

Закранаўшы арганізацыйныя пытаньні, Абрамовіч указаў, што заграніччная дэлегацыя санкцыянуе існаваньня і пэрсанальны склад «саюзнага бюро» і пакідае за сабой асноўнае палітычнае кіраўніцтва меншавіцкай работай.

Паказаньні падсуднага Громана

Громан указвае, што ён меў пэрсанальную гутарку з Абрамовічам, у якой апошні паведаміў, што мэтазгоднасьць інтэрвэнцыі для сацыял - дэмакратыі— ўжо бясспрэчны факт. Акрамя таго, Абрамовіч указаў, што «саюзнаму бюро» будзе аказана фінансавае падтрыманьне з боку нямецкіх сацыял-дэмакратаў і «левай» частцы «Торгпрома», з якім ужо вядуцца перагаворы. Допыт Громана перапынен да 6 гадзін увечары.

Меншавіцкая праграма ў дзеяньні

Вячэрняе пасяджэньне 4 сакавіка 31 г.

Вячэрняе пасяджэньне адкрываецца а 6 гадз. 30 хвілін. Працягваецца допыт Громана аб яго спатканьні з Абрамовічам у Маскве ўлетку 1928 году. Дырэктывы Абрамовіча зводзіліся да таго, што ў барацьбе з савецкай уладаю ўсе сродкі «дапусьцімы і мэтазгодны». У прыватнасьці, Абрамовічам на нарадзе, якая адбылася на кватэры ў Громана канчаткова было вырашана пытаньне аб блёку з ТКП і з «прампартыяй» і вызначаны шкодніцкія ролі. Падрабязнасьці нарад, якія адбыліся ў Маскве ў прысутнасьці Абрамовіча, паведамляюць і іншыя падсудныя—Якубовіч і Сакалоўскі.

Абрамовіч клянецца імем фашысцкага правасудзьдзя ў сваёй нявіноўнасьці

Тэлеграма Абрамовіча

Затым тав. Крыленка, пры напружанай увазе ўсёй залі, заяўляе: «Я хачу выканаць просьбу гр. Абрамовіча і прасіць суд далучыць да справы тэлеграму, атрыманую мною па радыё ад 2 сакавіка гэтага году. Акцявацца, Абрамовіч дае з Бэрліна ў Маскву паказаньні, «заверяныя пад прысягай нямецкім судом». Гэтыя паказаньні сьледуюць поштай. Абарона супроць далучэньня тэлеграм не пярэчыць. Суд задавальняе хадайніцтва абвінавачаньня і тав. Крыленка агалашае тэкст тэлеграмы:

«Масква. Абвінаваўцы Крыленка з Бэрліна.

— Атрымаўшы «Правду» ад 27 лютага з абвінаваўчым заключэньнем па інсцэніраваным вамі працэсе 14 чалавек, якія ніколі ня былі ў нашым бюро, катэгарычна заяўляю і прашу агалосіць на судзе, што ня толькі ўсе абвінавачаньні супроць нашай партыі зьяўляюцца хлусьнёй і паклёпам, але, у прыватнасьці, усе расказы аб маім, нібы, знаходжаньні ў Маскве ўлетку 1928 году—выдумка з пачатку да канца. У сапраўднасьці, я ня быў у Расіі з лістапада 1920 году і да сёньняшняга дня. Адпаведная фармальная заява пад прысягай, заверяная нямецкім судом, сьледуе поштай. Рафаіл Абрамовіч Рэйн-Абрамовіч».

Абаронца Браўдэ заяўляе, што тэлеграму такога-ж зьместу атрымала і абарона.—Тав. Швэрнік таксама заяўляе, што і судом атрымана падобная тэлеграма.

Тав. Крыленка зварачаецца да падсудных—старых меншавікоў Громана, Ікава і Шэра з пытаньнем аб тым, як яны расцэньваюць з пункту гледжаньня традыцый сацыял-дэмакратыі дачу паказаньня пад прысягай перад буржуазным судом.

Адказ Громана кароткі. Відавочна, заграніччная дэлегацыя ўжо забыла рэвалюцыйныя традыцыі. Яшчэ ў той час, калі меншавікі ўваходзілі з бальшавікамі ў адзіную сацыял - дэмакратычную рабочую партыю, якая называлася рэвалюцыйнай рабочай партыяй, партыяй рэвалюцыйнага сацыялізму, пры іх адносінах да буржуазнага ладу, якія ім былі ўласьцівы, спасыланьне на прысягу перад буржуазным судом не магло быць зроблена.

Падсудны Ікаў дадае: «Мне з большю і сумам прыходзіцца канстатаваць, што ў рэзультаце гэтай тэлеграмы выдомая сувязь і маральны ўдзел заграніччнай дэлегацыі канчаткова парываецца...» Шэр заўляе: «Натуральна, што заграніччная дэлегацыя, выкрытая нашымі паказаньнямі, карыстаецца усімі спосабамі, як уласнымі старымі традыцыямі, так і чыста буржуазнымі. У даным выпадку гэтая зброя цалкам узята з чужога буржуазнага арсэналу».

Падсудны Якубовіч кажа: «Гэта тэлеграма канстатуе, што заграніччная дэлегацыя шукае якой-небудзь аргумэнтацыі, якога-небудзь спосабу, каб абвергнуць нашы словы. Гэта лішны довад, што зробленыя намі паведамленьні адпавядаюць ісьціне, што Рафаіл Абрамовіч Рэйн-Абрамовіч быў у гэты час у Маскве. Трэба сказаць, што гэты факт зьяўляецца, мабыць, найменш разумным і найменш удалым з тых, што можна было-б ужыць для таго, каб адвесьці ўдар, нанесены меншавіцкаму гэтым працэсам».

Запкіна заяўляе: «Абрамовіч разьлічае на тое, каб узьдзейнічаць на ўсе буржуазныя і дробна-буржуазныя колы. Для іх гэта асабліва пераканаўча. Калі чалавек сказаў пад прысягай — гэта ўсё».

Гэта фактычна гэст, разьліч

Чаму вучыць капыльская справа

У Капыльскім раёне пядаўна *) адбыўся масавы працэс над 167 селянамі за невыканаўшае абавязацельствы на кантрактацыі сьвіней.

Судзілі бедняку, серадняку і нават батрасьнікаў.

Здаецца, на першы погляд, нічога тут няма. У чым тут антысавецкая сутнасьць? Дзе тут праваслаўны клясавага ворага? Судзілі пяспраўных селян за невыкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай. Зараз праводзіцца кампанія па набліжэньню сроку, так трэба дзяржаве, і суд «працесам 167» спрыяў гэтай кампаніі. Іменна так і вытлумачыў характар працэсу нарэдзьдзя Лашчэўскі і нічэ дадаў, што гэта ў Капылі сьмяшнае зьявішча. Капыльскі суд як правіла, ўмела і штучна падбіраў адпаведныя справы, групуючы іх у масавыя працэсы. Судзілі за адзін раз па 60-100 і больш асоб на адной справе. Судзілі, напрыклад, калі 100 хуліганаў, пекаль і дасяткаму селян за патрапу у дэсе, а вынаходку адлічнага с.-г. палітку і т. д.

— Так зручней, — гаворыць судзьдзя. І таму ўстаноўка Капыльскага суда была ўвесь час на масавым працэсы. Судзілі масамі, без падзелу на групы: бедняку, серадняку, кулаку. Капыльскі суд праводзіў «па-за клясавую лінію». Кулака і бедняка, не гаворачы ужо аб серадняку, Капыльскі нарэдзьдзя судзіў «адналькава». Бо кулак, на арыгінальні Лашчэўскага, не зьяўляецца клясавым ворагам савецкай дзяржавы. Гэта прызнаньне вырвалася ў Лашчэўскага, як ён гаворыць, выпадкова. Чым яму яхвотна верым, што гэта так. Але ад таго, што ён выпадкова выявіў свае контр-рэвалюцыйную сутнасьць, так справы не мяняецца. Клясавую лінію пралетарскага суда ў адносінах да кулака Лашчэўскі не праводзіў. Усе яго судовая практыка ў Капылі сьведчыць аб злосным скажэньні судовай палітыкі партыі і савецкай улады. І працэс 167 селян з насумненнасьцю гэта сьцьвердзіў.

Тут мы насумненна маем справу з чыста клясавым ворагам, які засеў у апарат народнага суда і сваёй падрыўной працай выконае заказ замежных інтэрвэнтаў — паларызаць асновы савецкага законадаўства і пасварыць асноўныя масы селянства з савецкай уладай.

Гэта бязумоўна так. Бо ужо хутка пасьля гэтага працэсу адна польская фашыстская газэта (манархічнае «Слово») паведаміла усяму сьвету аб гэтым працэсе, сказаўшы яго так, як толькі здолеў, а даволі калучы, друк» гэтага роду, які задыхаецца ў шалёнай злосьці ў адносінах да першай пралетарскай дзяржавы. Смакуючы на ўсе лады гэту навіну, захлынаючыся сьлінай апаратзтва, гэта беспардонная «газэтка», з бесарамнасьцю, якой няма роўнай, заявляе, што савецкі друк замоўчвае (???) працэс і арганізатары яго, моў, засталіся пакаранымі. Пралетарыі гэроям Луцку, фашысцкім шакалам ад друку трэба, што прышлася на іх долю.

Арганізатары і натхняльнікі працэсу ня толькі былі выкрыты рабоча-селянскім друкам, яны, зразумела, не засталіся не пакаранымі. Яны знаходзяцца на лаве падсудных і атрымаюць па заслугах.

Нас цікавіць другое пытаньне: як магла мець месца такія масавыя працэсы у нашых савецкіх умовах? Дзе было ўзьнікне кіраўніцтва? І тут трэба прызнаць, што кіраўніцтва праявіла поўную замяшанасьць у гэтай справе, шадольнасьць кіраваць пралетарскім судом, фармальна і перакручана ўдумачачы правільную дырэктыву ЦКК УсеКП(б) аб неўмяшаньні ў канкрэтныя судовыя справы, як неўмяшаньне, яно даходзіць да нейтралітэту пры ўсялякіх абставінах.

Бюро РК, прэзыдыум РКК і РВК праявілі апартуністычную недацэнку абавязранага клясавага змаганьня ў раёне і мэтаду, якімі клясавы вораг скарыстоўвае зьвяньні савецкага апарату і асобных нячэстных членаў партыі і савецкіх работнікаў. Кіруючыя работнікі раёну (сакратар РК, старшыня РККРСІ, старшыня РВК) своечасова ведалі аб працэсе, але не прынялі ніякіх сапраўдных мер, каб яго напрадзіць.

Партыкіраўніцтва настуе розно суда разумее вельмі своеасабліва. Зусім нечакана, 16-га лютага, у дзень прыезду камісіі ЦК, старшыня РВК накіраваў у суд сьпіс 35 калгасаў для прыцягненьня да адказнасьці за невыкананьне задач па лесавывазках. Ні бюро РК, ні фракцыя РВК ці яго прэзыдыум на працяку апошніх год ні разу не заслухалі дакладу аб рабоце судовых органаў. Як суд на чале з беспартыйным судзьдзёй ажыцьцяўляе судовую палітыку савецкай дзяржавы, раённае кіраўніцтва гэтым ня цікавілася. Між тым, Капыльскі раён адстае па ўсіх паказьніках: і па загатоўках усіх культур, і па мабілізацыі сродкаў, і па падрыхтоўцы да пасеўнай.

Клясавае змаганьне ў раёне разгарнулася па ўсім фронце. Часамі яно набывае характар адкрытых тэрарыстычных актаў супроць лепшых пралетарыяткоў калгасьнікаў, батрацтва і бедняты. Кулацкія падпявалы і крыкуны зрываюць сельскія сходы, там, дзе ставяцца пытаньні аб калектывізацыі і г. д.

Што процінастаўляе раённае кіраўніцтва дэзарганізатарскай рабоце клясавага ворага. Нічога, ці амаль нічога. Кулака ў раёне «не заўважвалі». На 10-та студзеня ў раёне лічылося... адзін кулак. Сьмешная рэч, але гэта факт. Кулака праглядзела старое апартуністычнае кіраўніцтва, зьнятае пастановай ЦК. З моманту «головокружения», калі пройшоў калектывізацыі дасягнуў 93,5 да лістапада, г. зн. на працягу 9 месяцаў раён знаходзіцца на хвалях самацёку і апартуністычнага «благодушия».

Не сустракаючы рашучага бальшавіцкага адпору, кулак спэкулюе як і ў іншых пагранічных раёнах, на ўсё бліжэйшае надыходзячай небясьпецы ваеннай інтэрвэнцыі міжнароднай контр-рэвалюцыі.

— Прыдуць белапалякі і перш за ўсё расстраляюць арганізатараў калгасаў і тых, хто першы запісваецца ў калгасы — вось зьмяшнае шпіцэньне кулакоў.

Партячэйкі паўінны мабілізаваць масы на жорсткі адпор гэтай праваслаўцы, але на справе партячэйкі і сельсаветы ў гэтай галіне аказаліся ў радзе выпадкаў інертнымі, бязьдзейнымі. І сапраўдны, самі, на сваёй ініцыятыве знайшлі сваяасаблівы і пекальні арыгінальны спосаб адказу на кулацкую правакацыю, які выкрывае усю сілу пралізарыята імкненьня бедняты і серадняку ісьці ў калгасы.

Група сялян в. Апошкі па сваёх уласным пачынаньні напісала заяву аб жаданьні арганізаваць калгас. Пад заявай падпісаліся ў форме круга, так што немагчыма ўстанавіць, хто першы падпісаў заяву, бо... круг. Каб перадаць заяву сакратара ад кулакоў і іх агентаў, даручылі зрабіць гэта ўночы, на кватэру сакратара партячэйкі. З сакратара партячэйкі перадаўшы заяву ўзяў абавязацельства не агалашаць яго прозьвішча. Калгас арганізаваўся. І гэта ля самай мяжы.

Да чаго даходзіць нагласьць кулака — ілюструе наступны факт. Група беднякоў і сераднякоў парашыла аб'яднацца ў калгас. Заможныя сяляне гэтай вёскі, якімі кіруе вопытная рука кулака, заявілі: добра, мы таксама ўсе пойдзем у калгас. Але нас большасьць, а вас менш і мы вас, як арганізатараў, выкінем з калгасу голенькімі.

Мы прабілі гэта адступленьне ад тэзы нашага артыкулу, каб паказаць, што ў падобных умовах напрыкрытага клясавага змаганьня роля ўсіх партыйных і савецкіх органаў нязьмерна ўзрастае. Хто-ж, як ня партыя і саветы стаяць на чале клясавага змаганьня?

Партыйная арганізацыя Капыльскага раёну не стаіць на ўзроўні гэтых задач, пасобныя зьвяньні арганізацыі не вядуць належнай барацьбы з кулаком. Сельскія саветы, праўда, напоўнены ўпэўнаважанымі на кампаніях з раёну, але яны, гэтыя апошнія, як правіла, бязьдзейнічаюць, не праўляюць бальшавіцкай настойлівасьці і рашучасьці ў змаганьні супроць кулака, часта падмяняюць сабою партячэйкі і сельсаветы, здымаючы з іх адказнасьць і алхілячы іх ад работы. Трэба адзначыць, што частка актыву ўсё яшчэ знаходзіцца на пазыцыях зьменена апартуністычнага кіраўніцтва, супрацьўяцца ў аснову правільнаму новаму кіраўніцтву РК, скажае ў сваёй практыцы ленінскі прынцып добраахвотнасьці ў калгасным руху, замяняючы яго самацёкам. Адзін з выступаўных на партактыве наступным чынам характарызаваў гэтых камуністаў:

— Насыпаюць з раёну ў сельсаветы ўпэўнаважаных на кампаніях, інструктуюць, накачваюць, кажуць, што на трэба на-бальшавіцку наступаць на кулака, у іх «рукі трасуцца, валенкі дрыжаць і сэрца мякне». Сьледам за імі трэба ехаць самому сакратару райкому падбадзёрваць іх, утаўрнаць. Але-ж сакратару райкому трэба займацца і іншымі справамі.

Боязьнь кулака, «як-бы чаго-небудзь не вышла», стаўка на «благодатный» самацёк — вось што адрозьнівае работу ў Капыльскім раёне. І толькі ў самы апошні час намецілася пазначэньне, але ўсё-ж прымітыўна пералом. Рост калгасаў за месяц узьняўся да 10 проц. Было — 7 проц. Арганізован рад калгасаў ужо ў апошнія дні на самой мяжы — у п. п. Братковы, Крывасёлкава, Кукавічы і г. д. І гэта ў той час, калі пасобныя партячэйкі пытаньні калектывізацыі ставілі толькі рэдка, пад націскам мас, у «розным». Значыцца, імкненьне ў калгасы ёсьць. Але няма масавай растлумачальнай работы, не адчуваецца арганізуючая, кіруючая роля партыйных ячэек і сельскіх саветаў. Да гэтага часу ня ўсе камуністы, што працуюць на вёсцы, зьяўляюцца членамі калгасаў, а сельсаветчыкі знаходзяцца ў калгасах на 20-25 проц. ня больш. І зусім разумна заяўляюць сяляне гэтым «агітатарам» за калгасы — ну, а як-жа ня сам — уступаеш?

Ва ўмовах праваслаўнай тактыкі кулака, які арыентуецца на прыход паноў, такія «прыклады» кіраўнікоў сельсаветаў ня спрыяюць калгаснаму прыліву.

У Капыльскім раёне практыкавалася своеасаблівая форма «пры раў старшынь калгасаў». Сядзець, напрыклад, які-небудзь там. Арыгінал і загадае ў раёне пашчоўным аддзяленьнем, але адначасова зьдзяйсьцца старшынёй калгасу. У апошнім ён, відома, ня бывае, але за тое пэнсію ён атрымлівае акуратна і ў хормін. Але калі кіраўніцтва павяло з гэтым скажэньнем барацьбу, знайшліся таварышы з партактыву, якія апраўдвалі гэты мэтад кіраўніцтва і гаварылі, што без сумяшчэньня ў калгасе на адну асноўную пэнсію цяжка пражыць.

Зусім неадпаўдальнымі ўнутраны стан калгасаў, якія ужо ёсьць. Адсутнічае элементарная арганізацыя працы, у палітуначасьці бедагаспадарчасьць і сяжэньцкія настроі — «спачатку сабе, а потым — дзяржаве». Ёсьць калгасы, якія маюць па некалькі тысяч абагуленай кулацкай маемасьці, але да гэтага часу ня выканалі абавязацельстваў перад дзяржавай і ня хочуць працаваць. Да гэтага часу ня скончан абмалот, не апрацована лён. Заданьні на ільне калгасы выканалі менш, як на адну трэцюю частку. А лён ёсьць, але не апрацаваны і ляжыць пад сьнегам. Запазычанасьць за калгаснікамі ў пасобных калгасах раўняецца 120-180 рублёў.

У раёне ёсьць магутная група саўгасаў, якая налічвае ня менш 600 пастаянных рабочых. Аднак, саўгасы не займаюць вядучай і арганізуючай ролі, ня зьвязаны з калгасамі, стаяць у баку ад пытаньняў барацьбы за калгасны прыліў. Рымшанская саўгасная ячэйка за год ні разу ня ставіла пытаньняў калектывізацыі.

Пасобныя партыйныя ячэйкі ў корані скажаюць асноўныя прынцыпы прыёму у партыю. У вясковай ячэйцы (с. Бабоўны) у ленінскія дні было прынята 5 чал. без рэкамэндацый. На сходзе былі дапушчаны да галасаваньня і беспартыйныя сз выпадку вялікай кампаніі. Потым аказалася, што прынятых нельга дапускаць да партыі і на гарматны стрэл. У пасобных ячэйках побач з напрыкрытым апартунізмам і прымірэнцтвам да кулака надавыла добра ўжываюцца грубейшыя антыпралетарацкіх перагібы. У Старакапыльскім сельсавеце цьвёрдымі заданьнямі былі абкладзены 25 проц. усіх гаспадарак сельсавету.

І на гэтым фоне агульнага стану ў раёне ўзьнік гэты агідзьнны працэс. Арганізатарам працэсу зьявілася ліквідацыйная камісія менскага аддзяленьня Белдзіргандлю, б. загатчык капыльскай канторы Эйцін і яго агенты Бохан і Кароткі. Ліквідацыйная камісія накіравала ў нарсуд сьпіс 167 селян, нібы парушаўшых дагавору аб кантрактацыі, аб спагнаньні з іх авансаў і пустоўкі наводле дагавору. На працэсе аказаліся «вінаватымі» грамадзяне 16 сельсаветаў. Нівадзіному селяніну ня было зачэпна зроблена нівадзіла папярэджаньня аб неабходнасьці вярнуць аванс. Дык за выкананьнем дагавору на кантрактацыі ніхто не сачыў. Сьвіней прымалі самацёкам. Прывёз — добра, а ня прывёз — таксама добра. У рэзультаце эпідэміі чумы у многіх селян сьвіні падохлі. Гэта зьсьведчана адпаведнымі актамі. Частка селян вярнула авансы Эйціну. Апошні ў сваёй рабоце практыкаваў прыём гропай дзо капала, бяз квітанцый і расьпісак і ўжо на судзе «на памяць» аднаго адпускаў, з другімі спрачаўся і г. д. Факты, выкладзеныя ў матар'ялах брыгады «Зьвязды», поўнасьцю пацьвердзіліся.

Эйцін да суда Эйціна прадставіў сьпіс звыш 30 чал., якіх «вызваляў» ад суду, як прыцягнутых памылкова. Аднак, на суд 12 студзеня Эйцін і ліквідацыйная камісія не зьявіліся. Суд быў адкладзен. Каля 200 селян пайшлі назад, абураныя бяздушнай цяганінай і галавацяпствам, праведзеным арганізатарамі гэтага працэсу і судом.

Што павінен быў зрабіць нарсуд у гэтым выпадку? Першым яго абавязкам было абавязаць ісьцю даць неабвержныя довады вінаватасьці селян, выявіць сапраўдную карціну і адпаведна клясаваму падыходу прыцягнуць да адказнасьці асоб, якія злосна ня выканалі дагавор ці не жадаюць вярнуць авансы. Суд гэтага не зрабіў. Прыкрываючыся фіскальнымі інтарэсамі і зручнасьцю разгляду справу пачкамі, ён назначыў другое слуханьне справы на 6 лютага.

Партыйнаму кіраўніцтву факт прыцягненьня да суда 167 селян быў відомы 12 студзеня. Але, не зразумеўшы палітычнай сутнасьці гэтай справы, сакратар РК і старшыня РВК даручылі РСІ расьсьледаваць гэту справу, ухіліўшыся па сутнасьці ад яе. Старшыня РККРСІ ня толькі ня выканаў гэтага даручэньня, але нішчо выехаў у Менск, не паведаміўшы аб гэтым ні бюро РК, ні члену прэзыдыуму РККР.

І гэтым справа на першым этапе была скончана. Да другога пасяджэньня суда ніхто гэтай справай ня цікавіўся, ды ня ведалі, што суд у другі раз будзе слухаць гэту справу. Не ідалі гэтаму ніякага значэньня. І калі 6 лютага, прыехаўшы з водпуску, раённы пракурор указаў, што справа будзе слухацца ў другі раз, для кіраўніцтва гэта зьявілася поўнай нечаканасьцю. На пастаўленае пракурорам пытаньне, што тут можа быць шкодніцтва ці поўная праваказцыя, і як-жа быць са справай, як яе паварнуць, — сакратар РК ня ясна прагаварыў: «трэба яе адкласьці, а, урэшце, чорт яе ведае, што тут рабіць». Кіраўніцтва правіла поўную замяшанасьць і адсутнасьць палітычнай чуласьці, не разгледзела антысавецкай, праваказцыйнай сутнасьці гэтай справы, накіраванай супроць саюзу рабочае клясы з серадняком, супроць плану кантрактацыі яравых.

Адліліць вялікі сляні на суд было немагчыма. І суд 6 лютага пачаўся. Ужо у самым працэсе выявілася, што большая палова селян дагавары выканала, у часткі сьвіні загінулі ад чумы, другія вярнулі авансы Эйціну, іншых проста не напрэдзілі, што трэба вярнуць авансы. Ні аб якім злосным невыкананьні дагавароў аб кантрактацыі, ці адмаўленьні вярнуць авансы хаця-б адной асобай з 167 і гаварыць ня прыходзіцца.

Пракурор у сваім выступленьні даў правільную ацэнку працэсу, як палітычнаму шкодніцтву і патрабаваў ад суда прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці арганізатараў працэсу: ліквідком, Эйціна і яго агентаў — Бохана і Кароткага. Сяляне выказалі сваё здавальненьне вопраскам. Суд пад націскам пракурора вынес гэту пастанову. Пералом у настроі селян быў створан. Але ўсё-ж калі кулаку гэту справу ўдалося выкарыстаць і ён пачаў агітацыю супроць кантрактацыі яравых.

Партыйнае кіраўніцтва і пасьля другога суда захоўвала алімпійскі спакой. І толькі 9 лютага было пастаўлена на бюро пытаньне аб працэсе, але дакладчык-пракурор пастановай бюро напрэдадалі быў пасланы у раён на кампаніях. І толькі 17 лютага, на другі дзень пасьля прыезду камісіі ЦК па гэтай справе, праз 4 дні пасьля апублікаваньня матар'ялаў аб судзе ў «Зьвязьдзе», быў заслухан даклад пракурора і пынята пастанова на гэтай справе. Прызнаючы на гэтым пасяджэньні, што бюро дапусьціла грубую палітычную памылку, недацаніла палітычнай сутнасьці гэтай справы, як вылазкі клясавага ворага, бюро тым ня менш напрабавала знайсьці стрэлачыка і на яго зваліць усю асноўную віну. Пракурору была прыпісана «палітычная блізарукасьць» і вынесена пастанова аб зьнятьці яго з работы з выняткам суровай вымовы з напярэдзяньнем. Пад уплывам камісіі ЦК гэта пастанова зьмянена.

У сваёй пастанове сакратарыят ЦК правільна кваліфікуе гэту справу, як палітычнае шкодніцтва.

Урокі гэтай справы павінны зьявіцца сыгналам ня толькі для партарганізацыі Капыльскага раёну. Яны сьведчаць аб тым, што некаторыя партыйныя зьвяньні страцілі клясавую пільнасьць і не стаяць на ўзроўні задач, пастаўленых партыяй. Асобныя камуністы забываюць, што кулак не заўсёды выступае толькі з нажом і абрэзам, што часта і ў большай частцы ён выбірае такія мэтады, якія накіраваны да таго, каб выкарыстаць пасобныя вучасткі нашага апарату, нячэстных членаў партыі і савецкіх работнікаў і праз іх павесьці разбуральную контр-рэвалюцыйную работу па заданьнях інтэрэнтаў. Працэс «прампартыі» гэта з усёй пераканальнасьцю выкрыў.

Вывад з гэтага трэба зрабіць адзін: вышэй падняць клясавую пільнасьць, напрымірыма змагацца за генэральную лінію партыі, з усёй палкасьцю, уласьцівай бальшавікам, супроць усялякага роду апартуністычных скажэньняў і правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе — вось задача кожнага камуніста, што працуе на вёсцы.

*) Гл. «Зьвязду» за 14 лютага.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад камісіі аб расьсьледваньні справы па арганізацыі ў Капылі судовага працэсу над 167 селянамі, ЦК КП(б)Б адзначае:

а) Арганізацыя судовага працэсу над 167 селянамі зьявілася фактычнай выпаткай клясавага ворага, які скарыстаў судовы апарат у сваіх клясава-варожых мэтах для падрыву гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы і саюзу рабочай клясы з асноўнымі масамі сялянства.

Непасрэдны арганізатар працэсу — народны суддзя Лашчэўскі зьявіўся фактычным правадніком кулацкай палітыкі пад прыкрыцьцём фармальна бюракратычных запу.

б) Працаўнікі канторы Дзяржгандальбепу Эйцін, Бохан і Кароткі, зьяўляючыся адкрытага агентурай кулацтва ў савецкім апараце, узьялі справу на лезвее хлусьлівых і блытаных матар'ялаў для таго, каб стварыць адмоўныя настроі з боку бяднота-серадняцкага сялянства да правядзеньня чэргавых гаспадарча-палітычных кампаній.

в) Вучасткавы пракурор зусім правільна ператкваў судовы працэс у працэс супроць яго арганізатараў і канчаткова выкрыў усю блытаніну і бесспадстаўнасьць гаў прыцягненьня іх арганізоўваўся працэс. Акрамя таго пастаноўка пытаньня аб працэсе пракурорам перад кіруючымі раённымі арганізацыямі і брыгадай рэдакцыі «Зьвязды» сьведчыць аб правядзеньні пракурорам правільнай палітычнай лініі.

г) Бюро Капыльскага райкому КП(б)Б, прэзыдыум РКК і фракцыя РВК праявілі апартуністычную недацэнку гэтай судовай справы, як вылазкі клясавага ворага. Ня гледзячы на тое, што большасьць членаў бюро райкому (Мурашкевіч, Шлейцэр, Квасю[illegible]) ведалі аб арганізацыі працэсу, імі ня было прынята ніякіх мер да своечасовага спыненьня працэсу, які быў яўнай выпазкай клясавага ворага, і прыцягненьня да адказнасьці яго арганізатараў.

Бюро райкому і прэзыдыум РКК зразумелі выключна фармальна і апартуністычна зусім - правільную дырэктыву ЦКК УсеКП(б) аб неўмяшаньні ў канкрэтныя судовыя справы і недацэньваюць кіраўніцтва партарганізацыі савецкімі арганізацыямі ў галіне судова-сьледчай работы.

д) Адсутнасьць шырока разгорнутай самакрытыкі ў арганізацыі спрыяла стварэньню судовага працэсу. Раённая газэта «Калгасьнік Капыльшчыны» не праводзіць рашучай барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і не зьяўляецца арганізатарам мас на пасіпхтаве выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній.

ЦК КП(б)Б адзначае, што рэдакцыя «Зьвязды» і не брыгада, якая працавала ў Капыльскім раёне, далі правільную ацэнку працэсу.

ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Райкому КП(б)Б зараз-жа разгарнуць шырокую растлумачальную работу аб палітычнай сутнасьці гэтай шкодніцкай справы сярод рабочых, батрацкай, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, ашчэ больш мабілізуючы ўсю партарганізацыю на барацьбу за генэральную лінію партыі, вядучы рашучую барацьбу з праявам апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад лініі партыі.

Райком КП(б)Б павінен мабілізаваць партарганізацыю на рашучую барацьбу з рэцыдывамі правага апартунізму, якія маюць месца, як вынік мінулага правапартуністычнага кіраўніцтва ў партарганізацыі.

2) Узмацніць кіраўніцтва раённай газэтай і рашуча разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку, мабілізуючы партарганізацыю і ўсю савецкую грамадзянасьць на ўзмацненьне работы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, на замацаваньне існуючых калгасаў, разгарнуўшы сапраўды бальшавіцкую работу па арганізацыі новых і прылюдзе батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас у існуючыя калгасы, на рашучае наступленьне на кулацтва і на пасьляховую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

3) Райкому КП(б)Б узмацніць кіраўніцтва работай савецкага і судова-сьледчага апарату, ачысьціўшы яго ад варожых і клясава-чужых элементаў, забясьпечыўшы правядзеньне сапраўды клясавай лініі ў рабоце саветаў, судова-сьледчых органаў і ўсіх арганізацый і ўстановаў раёну.

4) Прапанаваць пракурору рэспублікі тэрміновае скасаваць сьледзтва па гэтай справе, прыцягнуўшы да суровай адказнасьці асоб, вінаватых у арганізацыі судовага працэсу.

5) Скасаваць пастанову РК КП(б)Б аб вынесеньні вымовы вучасткоўваму пракурору.

6) За праяўленьня апартуністычныя адносіны з боку райкому да арганізацыі судовага працэсу і нерэагаваньне абвясьціць бюро райкому вымову. Прасіць ЦКК прыняць адпаведныя меры ў адносінах прэзыдыуму РКК.

НА АКАДЭМІЧНЫЯ САВЕЦЕ БАН

3-га сакавіка адбыўся пленум акадэмічнага савету Беларускай Акадэміі Навук. З дакладам аб бліжэйшых арганізацыйных задачах Акадэміі выступіў прэзыдэнт БАН тав. Горыч.

Спыніўшыся на тым, што БАН у мінулым была цытадэллю контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, на іх барацьбе, якую належыць правесьці БАН пад кіраўніцтвам партыі па зьнішчэньні рэшткаў контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўскай дзейнасьці, — тав. Горыч выкажае, як на сённяшнюю задачу на бліжэйшы час, канцэнтрацыю ўсёй навукова-дасьледчай работы пры Беларускай Акадэміі Навук.

Выступаўшыя ў спрэчках да дакладу т. Горыча адзначалі, што канцэнтрацыя ўсіх навукова-дасьледчых інстытутаў і навуковых сіл пры БАН, максімальнае падпарадкаваньне ўсёй працы Акадэміі задачам сацыялістычнага будаўніцтва — галоўнейшыя праблемы, якія трэба як найхутчэй вырашыць.

Па дакладу т. Горыча акадэмічны савет ухвалёў пастанову, у якой адзначае недавальняючы стан у галіне навукова-дасьледчай працы ў БССР, раскідаасьць навуковых кадраў, паралелізм і саматужніцтва ў навуковай рабоце і недавальняючую работу БАН у справе канцэнтрацыі навуковых сіл.

Акадэмічны савет лічыць, што такое становішча ў далейшым недапушчальна. Адзначаючы, што ў рэканструкцыйны перыяд работа навуковых устаноў набывае выключна важнае значэньне, што ўсякая раскіданасьць і саматужніцтва ў галіне навукова-дасьледчай работы перашкаджаюць вымаганьні ўстаноўленых неабходнае кіраўніцтва і стварэньню спрыяючыя ўмовы для дзейнасьці варожых нам элементаў, акадэмічны савет прызнае неабходнай канцэнтрацыю навукова-дасьледчай работы вакол Акадэміі.

З дакладам аб ходзе кампаніі выбараў у БАН выступіў тав. Шчарбакоў. [illegible] і навукакандыдатура. Камісія акадэмічнага савету, дакладна праверыўшы сьпіс кандыдатаў, прапанавала на зацьвярджэньне акадэмічнага савету 10 кандыдатур. Выбраны ў правадзейныя члены Беларускай Акадэміі Навук наступныя т.т.: Шчарбакоў, Панкевіч, Плятун, Лублянка, Сяргейка, Рыбін, Кедроў-Зіхман, граф Кроль, граф Бурстын, граф Нікольскі.

Акадэмічны савет [illegible] просьбай да Савету Народных Камісараў БССР аб зацьвярджэньні вышэйназваных таварышоў правадзейнымі членамі Беларускай Акадэміі Навук.

У прэзыдыум Акадэміі Навук уведзен тав. Шчарбакоў. Акадэмічны савет выбраў тав. Шчарбакова віцэ-прэзыдэнтам БАН.

Пастанова ЦК КП(б)Б

Нарада пры ЦК КП(б)Б па партасьвеце

Аб падрыхтоўцы партактыву

На раніцнім пасяджэньні 4-та сакавіка нарада абмеркавала пытаньне тэарытычнай вучобы партактыву.

З дакладам па гэтым пытаньні выступіў тав. Канакоцін, які, ахарактарызаваўшы працесы абвостранай клясавай барацьбы і зрухі клясавых суадносін у краіне, галоўную ўвагу сканцэнтраваў на задачах партыйнага актыву ў справе авуладаньня марксыцка - ленінскай тэорыяй, як неабходнай умовы для пасьпяховага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў барацьбе з правым і «левым» апартунізмам, у барацьбе з клясавым ворагам.

— Абвостраная клясавая барацьба — гаворыць тав. Канакоцін, — патрабуе ад партыйнага актыву асаблівай пільнасьці і чуласьці ў яго кіруючай рабоце. Гэтыя ўмовы патрабуюць ад нашага актыву, каб ён добра ведаў вучэньне Леніна аб клясавай барацьбе, тактыку гэтай барацьбы. Толькі ўзброіўшыся марксыцка - ленінскай тэорыяй, партактыў здолее правільна змагацца за лінію партыі, выразна цьвядоміць гэту лінію ў сваёй штодзённай рабоце.

Нацыянальная палітыка партыі — сустаўная частка змаганьня за сацыялістычнае будаўніцтва. Узбраеньне ленінскімі ведамі актыву ў надпытальні зьяўляецца неабходнай умовай для правільнай арыентоўкі ў складаных нацыянальных умовах, для правільнага ажыцьцяўленьня ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі ва ўсіх зьвяньнях КП(б)Б.

Мабілізуючы партыйныя масы на барацьбу за непахіснае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на барацьбу супроць апартунізму, трэба ведаць, што правыя і «левыя» апартуністы часамі адпрацоўваюць у нацыянальную вопратку, імкнучыся маскаваць гэтай вопраткай свой твар. Мы мелі ряд фактаў, калі правыя справы ў нас суправаджаліся [illegible] аб аграрнай палітыцы, прыкрываючыся нацыянальнымі асаблівасьцямі.

Правільнае кіраўніцтва масамі ў барацьбе за генэральную лінію, у барацьбе на два фронты зьвяўляецца адказнейшай задачай партактыву. У нас, у КП(б)Б, 86 проц. членаў партыі з 1926 году. Трэцюю частку партарганізацыі складаюць кандыдаты партыі. Мы нясем адказнасьць за выхаваньне маладзіка, які прышоў да нас у партыю, частка якога не прайшла школы грамадзянскай вайны. Мы адказны за выхаваньне таго маладзіка, які ня так даўно прышоў з вёскі на фабрыкі і заводы. Аб гэтым мы ні на хвіліну не павінны забываць гаворачы аб тэарытычнай вучобе партыйнага актыву. Со актыв [illegible] зьяўляецца [illegible] кіраўніком у падрыхтоўцы, у [illegible] (у сэнсе партыйнай [illegible] [illegible]), якія прышлі у нашу партыю.

Значэньне своеасаблівай тэорыі нам усім добра [illegible]. Тав. Сталін гаворыць: «у нас ніпер па-новаму стаяцца [illegible] аб палітычным партыі. Мы [illegible] перамагчы [illegible] за вымтрацць галовы нашым практыкам і ўзброіць іх марксыцка-ленінскай тэорыяй. Буржуазныя тэарэтыкі, як ідэолёгі буржуазіі, змагаюцца з намі, актыўна супроцьстаўляюцца марксыцка-ленінскай тэорыі. Рубінаўшчына ў палітэканоміі зьяўляецца ня толькі антымарксыцкай, антыленінскай, але проста контр-рэвалюцыйнай меншавіцкай тэорыяй. Праф. Рубін праводзіў свае погляды ў палітэканоміі, выконваючы задачы II Інтэрнацыяналу па падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі Савецкага Саюзу.

Тэорыя нацыянал-дэмакратызму зьвяўляецца ня толькі проста буржуазнай тэорыяй, а тэарытычным плянам на інтэрвэнцыі Беларусі з боку Польшчы.

Нам неабходна рэальна паставіць пытаньне накшт барацьбы з дэбораўшчынай на філёзофскім фронце. Канкрэтна стаіць задача выкрыцьця дэбораўшчыны перад усім актывам, перад партыйнымі масамі.

Мы ведаем, што так зв. сялянская працоўная партыя, гэта контр-рэвалюцыйная партыя ў сваіх паказаньнях спасылаецца на тое, што яна спадзявалася на падтрыманьне ў сваёй контр-рэвалюцыйнай [illegible] з боку правых апартуністаў — кулацкай агентуры. Выкрыцьцё карэньняў правага апартунізму, паказ куды вядзе тэорыя правага апартунізму, паказ на факты змыкі зьвеньняў — так званай СПП з правым апартунізмам таксама павінна зьяўляцца адной з задач у справе ўзбраеньня партактыву марксыцкімі ведамі.

За невялікі адрэзак часу ў БССР мы мелі шмат прыкладаў, калі гэтыя буржуазныя тэорыі знаходзілі свой адбітак на практыцы. Успомніце справу Барысаўскага партыкіраўніцтва. Яно не выпадкова праглядзела такую справу, калі 80% раскулачаных асоб знаходзілася ў калгасах. Невыпадкова Барысаўское кіраўніцтва праглядзела самыя агідныя праявы заціску самакрытыкі. Справы Каныша, Чарэі, Касьцюковіч і інш. зьяўляюцца ў значнай ступені адсутнасьцю патрэбных тэарытычных ведаў, неабходных для правільнага кіраўніцтва работай.

Наш партыйны актыў, бязумоўна, вырас, ідэолёгічна ўзмацніўся, але гэта далажэньне ня здымае вострасьці пастаноўкі пытаньня аб вучобе актыву.

Як-жа выконваюцца пастановы партыі аб вучобе актыву? Вельмі кепска. Мы сустракаемся з фактамі паўнепраўнай недавацэнкі ролі партыучобы. У Менску ў значнай меры пераламалі гэту закасьцінеласьць у адносінах да вучобы. Тут зараз працуюць курсы актыву, 600 чал. актыву займаюцца ў вячэрнім кампузе. Між тым, у адносінах выкананьня дырэктыў партыі аб камплектаваньні кампузу і савпартшкол мы мелі недапушчальныя адносіны з боку пасобных раёнаў. Пасобныя райкомы камандыравалі ў кампуз тых людзей, якія скажалі партыйную лінію ў сваёй практычнай рабоце, якія скампрамэтавалі сябе.

Наша задача — забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі аб партыйнай вучобе, ліквідаваць тыя прарывы, якія мы маем у гэтай справе, дабіцца таго, каб партыйны актыў быў прыкладным у справе авуладаньня марксыцка-ленінскай тэорыі.

Далей т. Канакоцін гаварыў аб сетцы партасьветы, формах і мэтадах вучобы і аб кніжках для актыву.

Рашучай барацьбой супроць апартуністычнай недацэнкі тэарытычнай вучобы, — заключае т. Канакоцін, — крыдаховаў і прарываў у гэтай справе, мы на актыву на выкананьне адной з важнейшых бевых задач КП(б)Б — сапраўднае ўзбраеньне марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Па вячэрнім пасяджэньні нарада абмеркавала даклад т. Пігрыцкай аб становішчы палітвучобы ў камсамоле.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Першарадная задача транспартных партарганізацый

—забясьпечыць поўную рэалізацыю адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК

Жлобінскі і Гомельскі чыгуначныя вузлы—у палоне апартуністычных тэмпаў

Па-ўдарнаму ажыцьцяўляем адозву

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспарце выклікала вялікі ўздым актыўнасьці і творчай ініцыятывы рабочых мас **Полацкага** чыгуначнага вузла.

Партыйны калектыў вузла зараз-жа пасьля распрацоўкі адозвы вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па яе давядзеньні да кожнага рабочага, па яе няўхільнай рэалізацыі на вузле. У рэзультате гэтага кіраўніцтва вузла з 1-га лютага працуе ўжо па-новаму. Арганізавана брыгада па праверцы становішча паравознага парку, праведзена спарываньне паравозных брыгад і групавое замацавань

ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК—
ЛЕПШЫ БАЛЬШАВІЦКІ ЎДАР ПА ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСЦКІХ ПЛЯНАХ САЦЫЯЛ-ІНТЭРВЭНТАЎ

Рашучым націскам на кулака, бязьлітасным ударам па права-„лявацкай" практыцы, па „тэорыі" нерэальнасьці плянаў, шырокай масавай работай сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і калгасьнікаў у бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў тэмпах загатовак

УСЮ КАМПАНІЮ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ ЦЕСНА УВЯЗАЦЬ З ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ І АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

Бальшавіцкія тэмпы яшчэ ня ўзяты

Чырвона-Слабодзкі і Глуск раёны—на апошнім месцы

Авошняя зводка аб ходзе ільназагатовак яшчэ раз гаворыць аб тым, што мясцовыя арганізацыі не ўзялі належных тэмпаў для забесьпячэньня поўнага выкананьня плану да канца ўдарнага месячніка.

Паводле зводкі Наркамгандлю, плян ільназагатовак **на 1-га сакавіка** г. г. выкананы толькі **на 33,2 проц.**

Матар'ялы, што сёньня друкуюцца, зьправа паказваюць на тыя прычыны, якія садзейнічаюць такім чарапаным тэмпам ходу вялікай гаспадарча-палітычнай кампаніі — ільназагатовак. Галоўныя прычыны тут хаваюцца ў тым, што па радзе раёнаў (Чашніцкі, Гарадоцкі, Сеньненскі і інш.) ня зроблен яшчэ досыць рашучы націск на кулацка-заможную частку вёскі, а ў асобных раёнах **цьвёрдыя заданьні нават яшчэ не даведзены да кулацкіх гасподарак**, а там, дзе даведзены, не праводзіцца іх своечасовае выкананьне. Такая правазапартуністычная практыка ў адносінах да кулака павінна быць самым бязьлітасным чынам выкрыта і вінаватыя павінны быць сурова пакараны. **Трэба ўжыць самыя рашучыя меры, якія прадугледжаны дырэктывамі вышэйшых арганізацый, да тых кулацка-заможных гасподарак, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў.**

З другога боку назіраецца ў асобных мясцох «лявацкія» перагібы, якія выяўляюцца ў тым, што **цьвёрдыя заданьні даводзяцца да серадняцкіх гасподарак.** На гэта зусім выразна паказала ў справаздачы пасяджэньня СНК, якая сёньня зьмяшчаецца ў нашай газэце. У **Слуцкім раёне** старшыня аднаго сельсавету давёў цьвёрдыя заданьні да 18 проц. гасподарак, у той час, калі паводле дырэктыў яны павінны быць даведзены да 5-7 проц. гасподарак. Супроць гэтых перагібаў павінна быць мабілізавана грамадзкая думка, трэба рашуча ўдарыць па іх правадніках, зьнімаючы з працы і аддаючы пад суд.

Характэрна, што па тых раёнах, дзе да час абвяшчэньня месячніка ўзьнята грамадзкасьць на ліквідацыю прарываў, дзе больш рашуча ідзе націск на кулака, дзе работа па загатоўках пераведзена па ўдарныя тэмпы, там назіраецца пераломны ў выкананьні ільназагатовак. Так, па **Лёзьненскім** раёне плян ільназагатовак па 1-га сакавіка выкананы на 93,6 проц., па **Дрысенскім** — на 72,1 проц., па **Высачанскім** — на 67,1 проц., па **Брагінскім** — на 66,5 проц., па **Кругляскім** — на 63,4 проц., на **Вузьдзенскім** — на 65,3 проц.

Ганебна адстаюць раёны: **Глускі**, які выканаў заданьне на 1-га сакавіка на 6,2 проц., **Мазырскі** — на 6,9 проц., **Парыцкі** — на 7,9 проц., **Рагачоўскі** — на 7,4 проц., **Сьвіслацкі** — на 8,1 проц., **Чырвона-Слабодзкі** — на 5,8 проц., **Нараўлянскі** — на 9,4 проц., **Дрыбінскі** — на 11,6 проц., **Гомельскі** — на 11,2 проц., **Ветрынскі** — на 10,1 проц., **Жлобінскі** — на 11,2 проц.

Заслугоўвае ўвагі карэспандэнцыя з **Барысава** аб тым, што большасьць членаў Забашэвіцкага сельсавету выступіла супроць націску на кулакоў, фактычна абараняючы апошніх. «Цацканьне» з кулаком назіраецца і ў радзе іншых месц.

Карэспандэнцыі, якія сёньня зьмяшчаюцца, таксама паказваюць, што ў радзе сельсаветаў **няма ўліку закантрактаванага ільну** і з гэтай прычыны збор закантрактаванага ільну праходзіць надзвычай марудна. Слабае паступленьне ільну па самазабязпечальствах ад бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а таксама ад калгасаў тлумачыцца **слаба разгорнутай касавай работай мясцовымі партыйнымі арганізацыямі, слабой мабілізацыяй грамадзкай думкі вакол гэтага пытаньня.**

Вялікім недахопам у кампаніі ільназагатовак зьяўляецца **няўвязваньне гэтай кампаніі з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы і новага калгаснага прыліву.** Не выкарыстоўваецца адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі, гэты важнейшы палітычна-гаспадарчы дакумант, паводле якога засеў тэхнічных культур, у прыватнасьці ільну, дае вялікія ільготы.

Прафсаюзныя арганізацыі яшчэ ня ўключыліся ў выстарчальнай меры ва ўдарную кампанію па выкананьні ільназагатовак.

Усім мясцовым арганізацыям трэба зараз-жа **пераключыцца на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы разгортаньня ільназагатовак**, якія-б забясьпечылі поўнае выкананьне пляну ільназагатовак да канца ўдарнага месячніка. Трэба мабілізаваць шырокія колы грамадзкасьці, выкарыстаць усе тыя меры, якія названы ў дырэктывах ЦК і СНК, трэба па-бальшавіцку змагацца за выкананьне гаспадарча-палітычнай задачы — выкананьне пляну ільназагатовак. **Рашуча ломячы сабатаж кулака, бязьлітасна ўдараючы па права-«лявацкай» практыцы ў ільназагатоўках, па самацёку і перагібах, па тэорыі «нерэальнасьці пляну» даб'емся ў бліжэйшыя дні карэннага пералому ў тэмпах ільназагатовак.**

Поўнае выкананьне пляну ільназагатовак зьвязана сапраўды **бальшавіцкім адказам на інтэрвэнцыянісцкія пляны сацыял-фашыстаў, непрымірымых ворагаў рабочай клясы Громанаў, Шэраў, Суханавых і інш.**

Забашэўскі сельсавет абараняе кулакоў

БАРЫСАЎ. (НАШ КАР.). ВЫПАДКІ ПАТУРАНЬНЯ КУЛАКУ ПА РАДЗЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ НЯ ЗЖЫТЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ.

У ЗАБАШЭЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ЗА РЭЗАЛЮЦЫЮ, ЯКАЯ НАТРАВУЕ ЎЖЫВАНЬНЯ РАШУЧЫХ МЕР ДА КУЛАКА-НЯЗДАТЧЫКА ІЛЬНУ, З ПРЫСУТНЫХ 22 ЧЛЕНАЎ СЕЛЬСАВЕТУ ГАЛАСАВАЛІ ТОЛЬКІ 4. РВК НА ГЭТА НЕ РЭАГАВАЎ.

НА РАДЗЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ НЯМА НІЯКАГА КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ. **ПЛЯН ПА РАЁНЕ ВЫКАНАН УСЯГО НА 13,5 ПРОЦ.** З 20 ПА 25 ЛЮТАГА ПАСТУПІЛА УСЯГО 1.050 КГР. ІЛЬНУ, А ПА ЛІНІІ РАЙКААПСАЮЗУ — 700 КГР.

АСАБЛІВА НІЗКІЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ДАЮЦЬ ЛОШНІЦКІ, ЗАЧЫЦКІ, БЫТЧАНСКІ, КАРСАКОЎСКІ, ПЕРАСАДЗКІ, ХАЎХОЛІЦКІ І ІНШ. СЕЛЬСАВЕТЫ. НЕКАЛЬКІ ПАДЦЯГНУЛІСЯ НАВАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ЯКІ ВЫКАНАЎ ПЛЯН НА **56,3 ПРОЦ., ЖЫТКАВІЦКІ — 56 ПРОЦ., ГЛІВЕНСКІ — 51,2 ПРОЦ., ЛОЗІНСКІ — 42,5 ПРОЦ.**

БАРЫСАЎСКІ.

72 проц. ёсьць, дабіцца 100 проц.

КРУГЛАЕ. ЗАДАНЬНЕ ПА ЗАГАТОЎКАХ ІЛЬНУ ПА РАЁНЕ ВЫКАНАНА НА 72 ПРОЦ., ПА ІЛЬНЯНЫМ СЕМІ — 79 ПРОЦ. АЛСТАЕ КАЛГАСНЫ СЭКТАР. ЗАДАНЬНЕ ПА ІЛЬНАВАЛАКНЕ КАЛГАСАМІ ВЫКАНАНА НА 64 ПРОЦ. ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ СПАГНАНА 97,5 ПРОЦ. УЗЯТЫЯ ТЭМПЫ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ ТРЭБА ЎЗМАЦНІЦЬ, КАБ ДА КАНЦА МЕСЯЧНІКА ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН НА 100 ПРОЦ.

БРЫГАДЗІРЫ:
ФЛЕЙШАР, ПУЛЬЯНАЎ, ШЫФРЫН.

Пытаньне аб ільназагатоўках на пасяджэньні СНК

Становішча выкананьня пляну ільназагатовак на 1-га сакавіка прымушае з усёй рашучасьцю канстатаваць, што ў гэтай справе яшчэ ня ўзяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы, прычым ПЕРШЫЯ ДНІ ЎДАРНАГА МЕСЯЧНІКА НЕ ЯВІЛІСЬ КОЛЬКІ-НЕБУДЗЬ ВІДАВОЧНАГА ПЕРАЛОМУ.

На апошнім пасяджэньні СНК тав. БАЛІЦІН прыводзіў наступныя лічбы: на 16/25 лютага плян ільназагатовак выкананы усяго на 32,2 проц. За тры дні—да 4-га сакавіка процант выкананьня павялічыўся толькі НА 1 ПРОЦ. Такім чынам, замест нарастаньня тэмпаў выкананьня пляну ўсё той-жа правазапартуністычны спакой, чарапашыя тэмпы. Характэрна, што нават па тых раёнах, работнікі якіх выклікаліся ў СНК для справаздачы, таксама няма пералому. ЛЕПЕЛЬСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН УСЯГО НА 8,7 ПРОЦ., ДРЫСЕНСКІ — НА 11 ПРОЦ.

Чым прычына такога ганебнага становішча з ільназагатоўкамі?

Галоўная прычына—У НЕДАЦЭНЬНІ ВАГІ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ДЛЯ ЛЕГКАСЬЦІ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ЭКАНОМІІ САМАЦЕКУ, У ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПАЛІТЦЫ САМАЦЕКУ, У ПЕРАШУЧЫМ ПРАЦЭСКУ НА КУЛАКА, У СЛАБЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ІЛЬНУ З КАНТРАКТАЦІІ, У АБСУТНАСЬЦІ МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЙ ЧАСТКІ ВЁСКІ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ.

ІЗ ГЛЕДЗЯЧЫ НА КАТЭГАРЫЧНЫЯ ДЫРЭКТЫВЫ ДАВОДЗІЦЬ ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНЯ ДА 5-7 ПРОЦ., ПАВОДЗІЦЬ ІХ ПА РАЁНЫ ДАВОДЗІЦЬ ІХ ДА 1, 2 І 3 ПРОЦ. ГАСПАДАРАК. Прычына у пасобніцтве разных і вёсках паўсюдна, зразумелі гэту дырэктыву, давёўшы 5-7 проц. узьвялічэньня ад іх гэтым з агульнага пляну ільназагатовак на даным населеным пункце, ён чаго атрымалася нагрузка на кулака большая, чым на кулака. Узьнікла ў ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ ЯКІЯ ПРАЎЫЯ ЗАДАНЬНЯ, а аддалі пад суд за невыкананьне ільназагатовак. У радзе месц, як высьвятлася на пасяджэньні СНК, не даведзены яшчэ пляны ільназагатовак да вёсак.

ЗАГРОЗВА ЦК І СНК АБ КАНТРАКТАЦІІ, ЯКАЯ ПРАДУГЛЕДЖЛАЕ ЗАБОР ЛЬНУ ПРАЦЭСКУ КАНТРАКТАНТАМ І ПРЫНЯЦЬЦЯ КАПІТАЛЬНАЯ ЗМАГАЛЬНЯ ПА ГЭТУ СПРАВУ ПА ГЫЛЯРЫСТАНА ДЛЯ ЎЗКАЦНЕНЬНЯ ЗАГАТОВАК.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з правазапартуністычнай «тэорыяй» аб нерэальнасьці пляну загатовак. ВЕТРЫНСКІ РАЁН ГАНЕБНА АДСТАЕ ПА ЗАГАТОЎКАМ ІЛЬНУ. ПРЫЧЫНЫ ЯКІЯ ПРАЦЭСКУ ПРАЦЭСКА ПА ВЫСОКАЙ ЦЭНЕ.

А ЧЫМ ГЭТА СЬНЕДЧЫЦЬ? Не аб нерэальнасьці пляну, а аб слабой работе мясцовых заготарчых арганізацый, якія ня зладзілі прымушэньня ільну з кантрактантаў, не наладзілі адпаведнай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі для выкананьня пляну ільназагатовак.

Што трэба зараз зрабіць, каб дабіцца поўнага выкананьня пляну ў працягу месячніка? Аб гэтым СНК вынес цьвёрдае рашэньне.

Упаўнаважаным ЦК і СНК на мясцох трэба ПРАВЕРЫЦЬ УСЮ ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ПА ДАВЯДЗЕНЬНІ ПЛЯНУ ДА ВЁСКІ, ПА ДАВЯДЗЕНЬНІ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК, ВЫПРАВІЦЬ НА-ХАДУ ПАМЫЛКІ, ДАПУШЧАНЫЯ НА СХОДАХ ПА ЗЬМЯНШЭНЬНІ ВЫЗНАЧАНЫХ ЗАДАНЬНЯЎ, ПРАВЕРЫЦЬ, ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА КУЛАКАМІ ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ, ПРЫМАЮЧЫ РЭПРЭСЫЎНЫЯ МЕРЫ ДА ТЫХ, ХТО САБАТУЕ ЦЬВЁРДЫЯ ЗАДАНЬНІ, ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК ВЁСКІ ПА ЗДАЧЫ ІМІ ІЛЬНУ ПА САМАЗАБЯЗПЕЧАЛЬСТВАХ, ДАБІЦЦА ПОЎНАЙ ЗДАЧЫ НАЛЕЖАЧАГА ІЛЬНУ АД КАНТРАКТАНТАЎ. Судова-сьледчыя органы павінны моцна нараць кулацкіх няздатчыкаў ільну, разглядаючы гэтыя справы без чаргі.

Характарны прыклад права-«лявацкай» практыкі прыводзіў на пасяджэньні СНК т. ГАЛАДЗЕД. У СЛУЦКУ старшыня сельсавету ў гутарцы з т. Галадзедам прасіў дазволу давесьці цьвёрдыя заданьні ДА 30 ПРОЦ. гасподарак, бо даведзеныя заданьні да 18 ПРОЦ. гасподарак, па яго думцы, не гарантуюць выкананьні. Калі т. ГАЛАДЗЕД запытаў, ці выканалі заданьне тыя 18 проц. гасподарак, якія абкладзены, старшыня сельсавету прызнаўся, што з іх яшчэ ніколькі не спагнана.

Такім чынам, замест выкананьня дырэктывы вышэйшых органаў аб даведзеньні цьвёрдых заданьняў да 5-7 ПРОЦ. гасподарак і сапраўдным націску на іх, каб выканаць плян сёлачасова, некаторыя работнікі імкнуцца як можна больш ахапіць гасподарак цьвёрдымі заданьнямі, робячы такім чынам «страшны» пораніб, і адначасова праводзячы правазапартуністычную практыку — не змагаюцца за канкрэтнае выкананьне пляну.

Па ўсёй такой права-«лявацкай» практыцы трэба нанесці ўдар, супроць [illegible] ДА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК, ПРЫМУШАЮЧЫ САМЫЯ ГАШУПАРАК, ПРЫМУШАЮЧЫ ІХ ВЫКАНАЦЬ [illegible] ЧЫ ПЛЯН ДА ІХ ВЫКАНАНЬНЯ.

Вялікія [illegible] ільназагатовак [illegible] ільну на поранішнім [illegible] на ўдарнае месячнік [illegible] ладзіць прарывы. А [illegible] ладзіць гэту [illegible] Гаму недахоп трэба [illegible] давёўшы штэ[illegible] пытаньня [illegible] і [illegible] вёсак, калгасаў і сельсаветаў [illegible] патрэбных мер да спагнаньня [illegible].

Работа ўраду БССР, у прыватнасьці работа Наркамасьветы, за гэты час ішла пад пунктам погляду выкананьня дырэктыў XVI зьезду партыі, на якім асабліва востра стаяла пытаньне аб культурнай рэвалюцыі ў сувязі з увядзеньнем усеагульнага абавязковага навучаньня. Тэмпы, якіх мы дасягнулі ў культурным будаўніцтве за гэтыя два гады, — нячуваныя тэмпы ў культурным будаўніцтве паогул і ў БССР асабліва.

За бальшавіцкую пяцігодку, супроць нацдэмаўскага шкодніцтва

Пяцігадовы плян культурнага будаўніцтва БССР, які быў складзены Наркамасьветы і сьпяканны Дзяржплянам (у якім знаходзіўся вядомы контр-рэвалюцыянэр, нацдэм, шкодник Краскоўскі на плянаваньні культработы), цягнуў нас не наперад, а назад.

Я вам падам прыклады. Паводле пяцігадовага пляну, які складзен быў у свой час па культурным будаўніцтве, прадугледжвалася наступнае: ахоп дзяцей дашкольнага ўзросту дашкольнымі установамі да канца пяцігодкі, г. зн. да 1932-33 г., усяго на 6 проц., усеагульнае навучальнае павінна быць скончана і ліквідавана пяцімесячнасьць у 1932-33 г.

Ня менш яркія лічбы і па рабочай асьвеце: паводле пяцігодкі ў нашых рабочых факультэтах павінна было быць да канца пяцігодкі 3.200 чал. Гэта пяцігодка перавыканана. Зараз вызначана [illegible] чал. — павялічэньне амаль у чатыры разы. І цяпер мы ў рабочых факультэтах маем каля 8.000 чал., а было 3.200. Мы такім чынам ужо ў гэтым годзе па рабочых факультэтах, па рабочай асьвеце перавыкананы пяцігодку ў два і [illegible].

Прадбачылася пяцігодкай падрыхтаваць 4.800 чал., а запраектавана зараз 19.380 чал., у 4½ разы больш. Зараз мы маем у нашых розных тэхнікумах: індустрыяльных, сельска-гаспадарчых і педагагічных каля 16.000 чал. Такім чынам, мы ў гэтым годзе выконваем у тры разы больш таго, што вызначаны пяцігодкай. І па целым радзе іншых культурна-асьветных устаноў, як напрыклад, па ліквідацыі пісьменнасьці, мы таксама павялічылі тэмпы, заканчваем ліквідацыю пісьменнасьці ў асноўным у гэтым годзе, тымчасам як скончэньне прадбачылася ў 1933 г. Заканчваем увядзеньне усеагульнага навучаньня таксама ў 1931 г.

А як-жа стаяла справа са зьместам работы нашых школ? У гэтых адносінах праграма камуністычнай партыі гаворыць наступнае: «У перыяд дыктатуры пралетарыяту — гэта значыць у перыяд падрыхтоўкі ўмоў, пры якіх робіць магчымым поўнае ажыцьцяўленьне камунізму, школа павінна быць ня толькі праведніком прынцыпаў камунізму наогул, але і праведніком ідэйнага арганізацыйнага і выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на поўпралетарскія і непралетарскія пласты працоўных мас у мэтах выхаваньня неабходнага здольнага кадраўскага змагарства камунізму».

Зусім іншыя установкі давяліся ЦК Асьветы пры нацдэмаўскім кіраўніцтве ў сыстэме народнай асьветы на сэсіі ЦВК БССР у 1928 г. Гэтыя ўстаноўкі знайшлі свой адбітак у статуце нашай адзінай працоўнай школы.

У чым сутнасьць гэтых установак? Сутнасьць гэтых установак заключаецца ў тым, што школа павінна даваць такія і такія веды і больш нічога. Ні слова пра аб тым, што школа павінна выхоўваць рэвалюцыянэраў-барацьбітоў за камунізм, ні слова ня сказана аб тым, што школа знаходзіцца адным з галоўных фронтаў у камуністычным выхаваньні падрастаючага пакаленьня.

У сучасных межах БССР на культурнае будаўніцтва выдаткоўвалася 15 мін. рублёў у сучаснай валюце, у гэтым 1931 годзе выдаткоўваецца на культурнае будаўніцтва 128 млн. руб. па кантрольных лічбах. З мінулым годзе выдаткоўвалася каля 80 млн. руб. па кантрольных лічбах на ўсё культурнае будаўніцтва.

Трэці рашаючы год пяцігодкі зьяўляецца пераломным годам і ў культурным будаўніцтве. Мы ў гэтым годзе ажыцьцяўляем канчаткова ліквідацыю пісьменнасьці, мы ў гэтым годзе выконваем у тры разы больш таго, што вызначаны пяцігодкай. І па целым радзе іншых культурна-асьветных устаноў, як напрыклад, па ліквідацыі пісьменнасьці, мы таксама павялічылі тэмпы, заканчваем ліквідацыю пісьменнасьці ў асноўным у гэтым годзе, тымчасам як [illegible] ліквідацыі пісьменнасьці [illegible] ня [illegible] ліквідацыі пісьменнасьці [illegible] ня [illegible] ліквідацыі пісьменнасьці [illegible] ня

Сакавік--рашаючы месяц ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінплянаў

Месячнік рацыяналізацыі--падоўжыць да 1-га красавіка

ПРАМОВУ тав. СТАЛІНА--ДА КОЖНАГА РАБОЧАГА

(Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б па пытаньні аб ходзе выкананьня прамфінпляну па прадпрыемствах г. Менску)

Канстатуючы невыкананьне прамфінпляну пераважнай большасьцю прадпрыемстваў г. Менску, бюро гаркому лічыць, што асноўнымі прычынамі такога становішча зьяўляюцца:

а) Зусім слабая перабудова партыйнай работы ў цэху, аб чым сьведчыць тое, што партыйная група ў большасьці прадпрыемстваў ня стала АСНОЎНЫМ ЗЬВЯНОМ партыйнай работы на прадпрыемстве.

б) Рад партыйных і прафсаюзных арганізацый замест скарыстаньня і разьвіцьця вытворчай актыўнасьці рабочых, што асабліва выявілася ва ўдарным квартале—аслабілі работу па мабілізацыі мас вакол задач выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, аб чым сьведчыць РОСТ ПРАГУЛАЎ І ЗНІЖЭНЬНЕ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, АСЛАБЛЕНЬНЕ РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА ПА РАДЗЕ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, АДСУТНАСЬЦЬ ШТОДЗЕННАЙ, КАНКРЭТНАЙ АПЭРАЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН У БОЛЬШАСЬЦІ ВЫТВОРЧЫХ ЯЧЭЕК ЗА ГЭТЫ ПЭРЫЯД.

в) Органы забесьпячэньня сырцом у радзе аб'яднаньняў (хэмаб'яднаньне, лесааб'яднаньне, мэтазяаб'яднаньне, ВКС)—ня здолелі перамагчы нават і дробных труднасьцяй, выклікаўшы значныя перабоі ў рабоце прадпрыемстваў.

г) Частка аб'яднаньняў, а таксама апарат ВСНГ не перабудавалі сваёй работы ў напрамку ўзмацненьня апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва сваімі прадпрыемствамі (хэм., лес., мэтал. аб'яднаньні), што тармазіла барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну. Лічачы такое становішча чука недапушчальным, бюро гаркому КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. САКАВІК МЕСЯЦ АБВЯСЬЦІЦЬ МЕСЯЦАМ ПОЎНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ СТУДЗЕНЬСКАГА І ЛЮТАЎСКАГА ПРАРЫВАЎ І ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ 1-га КВАРТАЛУ.

У бліжэйшыя дні склікаць сходы парт'ячэек, ячэек ЛКСМ, зьлёты ўдарнікаў, сходы рабочых, на якіх паставіць даклады дырэктарэў аб прарыве ў выкананьні прамфінпляну і канкрэтных мерапрыемствах па яго ліквідацыі. Мабілізаваць камуністаў, камсамольцаў і шырокія масы беспартыйных рабочых на барацьбу за ліквідацыю прарываў. Вызначыць канкрэтны мабілізацыйны плян, у якім прадугледзець усе мерапрыемствы па ліквідацыі прарываў, як: тэрміны, якімі сіламі і г. д. З усёй сілай павесьці барацьбу за поўнае выкананьне і перавыкананьне ўсіх якасных паказальнікаў прамфінпляну.

2. У мэтах хутчэйшай ліквідацыі прарываў, бюро гаркому прапануе выкарыстаць мэтады работы ўдарнага кварталу, у прыватнасьці ў пяцідзённы тэрмін правесьці наступнае:

а) перагледзець заданьне прамфінпляну на варштат у сувязі з прарывам, даўшы да 10-га сакавіка штодзённае заданьне выпрацоўкі на кожнага рабочага, прычым камуністы і камсамольцы на прадпрыемствах павінны паказаць прыклад у выкананьні павышаных заданьняў;

б) забясьпечыць сапраўды кіруючую ролю камуністаў у барацьбе за выкананьне прамфінпляну;

в) зьнішчыць выпадкі і папярэдзіць у далейшым ужыванне звышнармовай працы, што мела месца, з мэтаю ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну;

г) на бюро ячэек кожную пяцідзеўку заслухоўваць інфармацыі аб ходзе выкананьня прамфінпляну і ліквідацыі прарываў;

д) арганізаваць штодзённае шырокае давядзеньне ходу выкананьня плянавага заданьня рабочымі (дыяграмы, пёзунгі, дошкі і г. д.).

3. Бюро гаркому лічыць асабліва недапушчальным поўнае аслабленьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва на наступных прадпрыемствах: «КАМУНАРКА», ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», ГУТА «ПРАЛЕТАРЫ», СЬПІРТАЗАВОД, «ЭЛЬБОД». Лічачы гэта асноўнай прычынай невыкананьня прамфінпляну і найбольш выразным праяўленьнем правай практыкі, бюро гаркому папярэджае бюро памянёных парт'ячэек і абавязвае ўсе вытворчыя парт'ячэйкі ПРАВЕРЫЦЬ СТАНОВІШЧА САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. Барацьба за поўнае выкананьне прамфінпляну і ліквідацыю прарываў павінна выклікаць больш рэст папітычнай актыўнасьці рабочых мас, які неабходна ножнай ячэйцы сваячасова арганізацыйна замацаваць, арганізацыю новых ударных брыгад, разьвіцьцё сацспаборніцтва і вярбоўкі перадавых рабочых-ударнікаў у рады партыі.

4. Канстатуючы аслабленьне ўвагі да пытаньняў якасьці прадукцыі—заслухаць на наступным пасяджэньні бюро пытаньне аб становішчы якасьці прадукцыі.

5. Канстатаваць значны рост прагулаў і зьніжэньне працоўнай дысцыпліны на радзе прадпрыемстваў (завод «ДРЗВААПРАЦОЎШЧЫК», гута «ПРАЛЕТАРЫ», РЫМАРНАЯ ФАБРЫКА і інш.). Бюро гаркому абавязвае партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і гаспадарнікаў павесьці рашучую барацьбу з прагуламі, скарыстоўваючы формы і мэтады работы, якія ёсьць у гэтай галіне (пёзунгі, плякаты, сходы прагульшчыкаў, сходы іх жонак, абвесткі на дом, паказ канкрэтных страт, рабочыя заспоны), ужываючы да злосных прагульшчыкаў рэпрэсыўныя меры.

6. Рацыяналізатарская работа, работа па зборы рабочых прапаноў на большасьці прадпрыемстваў зусім аспабла. Ёсьць прадпрыемствы, дзе на працягу студзеня і лютага ня было ні адной рабочай прапановы («КАМУНАРКА», фабрыка ІМЯ 8-га САКАВІКА, «КАСТРЫЧНІК», ШПАЛЕРНАЯ ф-ка, ДРУКАРНЯ ІМЯ СТАЛІНА, «ЧЫРВОНЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫК» і інш.). Зусім адсутнічае вытворчая прапаганда.

У сувязі з тым, што абвешчаны месячнік рацыяналізацыі праходзіць нездавальняюча, бюро гаркому лічыць неабходным падоўжыць яго ДА 1-га КРАСАВІКА і абавязвае парт'ячэйкі зараз-жа праверыць ход выкананьня плянавага заданьня рабочымі (дыяграмы, пёзунгі, дошкі і г. д.).

Арганізаваць збор рабочых прапаноў, масавую вытворчую прапаганду, разгарнуць шырокую сетку тэхнічных гурткоў, дабіваючыся поўнага аўладаньня вытворчымі працэсамі, асьвятленьня новай тэхнікі механізмаў і максымальнай механізацыі работ. Выходным момантам разгортваньня гэтай работы павінна стаць ПРАПРАЦОЎКА ВЫСТУПЛЕНЬНЯ тав. СТАЛІНА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ ПРАЦАЎНІКОЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЯКОЕ ПАВІННА БЫЦЬ ДАВЕДЗЕНА ДА КОЖНАГА КАМУНІСТА І БЕСПАРТЫЙНАГА РАБОЧАГА.

Культпропу гаркому падрыхтаваць і прадставіць на чарговае пасяджэньне бюро гаркому прапановы па пытаньні разгортваньня тэхнічнай прапаганды.

Белрыба захлынаецца ў хвалях безгаспадарчасьці

У друку шмат пісалася аб агідных зьявішчах у прудавой гаспадарцы Белрыбы.

Мінулай зімой у зімавальнікі прудавой гаспадаркі «Чырвоная зорка» (Жыткавіцкага раёну) было пасаджана 223.000 гадавікоў карпа, вылаўлена-ж восеньню толькі 99.000 гадавікоў. Такім чынам, гаспадарка мела 58 проц. адходу (замест дапускаемых 20 процантаў). Спэцыяльнае абсьледаньне, зробленае ў сувязі з гэтым, выявіла, што зімавальнікі ў «Чырвонай зорцы» ня годны для засаджэньня іх гадавіка карпа.

Але гаспадарнікі з Белрыбы не прынялі мер для паляпшэньня становішча зімавальнікаў. У выніку ў гэтым годзе гібель гадавікоў набыла яшчэ больш буйныя размеры. Калі ў мінулым годзе гадавік пачаў вымераць у канцы зімы, дык у гэтым годзе ён пачаў вымераць як толькі быў пасаджаны.

Белрыба пасадзіла гадавіка-карпа значна больш, чым гаспадарка можа ўмясьціць. Калі ў 1929 годзе ў зімавальнікі было пасаджана ўсяго 223 тыс. гадавікоў, дык у 1930 годзе было пасаджана... 306.000, амаль што на 40 процантаў больш. Прычым зусім ня ўлічвалася нормавая вага пасадкі, а садзілі на штукі.

У 25 кілёмэтрах ад прудоў «Чырвонай зоркі» ёсьць беларускія пруды, дзе ў мінулым годзе было пасаджана 124.000 гадавікоў і адход быў усяго 16 проц. (нижэй нават дапускаемага). І вось «спэцы» з Белрыбы ў зімавальнікі беларускіх прудоў пасадзілі ў гэтым годзе толькі 104.000 гадавікоў — на 20 проц. менш, чым у мінулым годзе. Цяпер яны задумаліся, але-ж... позна. У такія марозы перавозіць гадавікоў за 25 кілёмэтраў з «Чырвонай зоркі» ў беларускія пруды немагчыма, бо ў выніку перавозкі гадавікі загінуць.

Характэрна, што ў Белрыбе ёсьць спэцыялісты-біолёгі, але яны ўсім на цікавіліся становішчам гаспадарак Белрыбы. Гэтыя спэцыялісты прасядзелі два месяцы ў камандыроўцы ў Маскве, выдаткавалі шмат дзяржаўных сродкаў, а канкрэтных вынікаў ад іх работы пакуль што ня відаць.

Наогул трэба сказаць, што, ня гледзячы на тое, што ў апараце Белрыбы ёсьць 6 рыбазводаў з вышэйшай асьветай, рыбная справа ў БССР і на сёньняшні дзень ня зрушана з месца ў бок паляпшэньня. Для вывучэньня пытаньня аб выкарыстаньні натуральных водаёмаў, якія могуць з'яканомінь шмат дзяржаўных сродкаў, што ідуць на будаўніцтва прудавых гаспадарак, амаль нічога ня зроблена.

РСІ павінна дэтальна азнаёміцца з агідэйшымі зьявішчамі, якія маюць месца ў прудавой гаспадарцы і прыняць рашучыя меры да зьнішчэньня іх. **Рыбная гаспадарка БССР павінна на справе стаць адной з буйнейшых крыніц рабочага забесьпячэньня.**

Р.

МЕНСК

Набор у ФЗВ працягнут

Прэзыдыум ВСНГ БССР аданачыў, што гаспадарчыя аб'яднаньні зусім не падрыхтавалі лютаўскага набору ў школы ФЗВ. Кантрольныя лічбы на былі нават давядзены да ФЗВ.

Прэзыдыум пастанавіў працягваць набор у ФЗВ. **Завод «Ударнік» перадаецца мэтазяаб'яднаньню для арганізацыі школы ФЗВ.**

Лесбелу даручана ізабыць 20 стандартных дамоў для патрэб ФЗВ. Дамы будуць разьмеркаваны паміж аб'яднаньнямі.

Узьнята хапайніцтва перад Наркамасьветы аб датэрміновым выпуску лепшых вучняў апошніх курсаў сямігодак для укамплектаваньня ФЗВ.

Новае праўленьне Дому Пісьменьніка

3-га сакавіка на агульным сходзе пісьменьнікаў гор. Менску перазьбрана праўленьне Дому Пісьменьніка.

У склад праўленьня выбраны т. т. **Крапіва, Галавач, Александровіч, Жылуновіч, Маўр, Харык, Лынькоў, Ліпнёны і Хведаровіч.**

У рэвізійную камісію выбраны т. т. **Чарот, Мурашка, і Ільлінскі.**

Старшынёю праўленьня Дому Пісьменьніка выбран т. **Крапіва**, яго намесьнікам тав. **Галавач**, сакратаром т. **Маўр.**

Старастаты дэпутатаў гарсавету

Прэзыдыум гарсавету пасталавіў арганізаваць на ўсіх прадпрыемствах гораду, якія выбралі ў гарсавет ня менш 3-х дэпутатаў, — старастаты ў складзе дэпутатаў гарсавету, наказасадцелаў, грамадзкіх абвінаваўцаў, камісій сацзейнасьці дзяржкрэдыту і інш. савецкага актыву.

На прадпрыемствах, якія маюць менш 3-х дэпутатаў, будуць арганізаваны аб'яднаньні старастаты.

Агульныя сходы старастатаў выбіраюць бюро з 3-5 чал. Разам з партыйнымі, прафсаюзнымі і грамадзкімі арганізацыямі старастаты будуць правозіць барацьбу за выкананьне прамфінплянаў, за лепшую пастаноўку культработы і інш. Старастаты робяць справаздачы аб сваёй рабоце перад сваімі сяўцямі гарсавету.

Для кіраўніцтва старастатамі пры гарсавеце будзе створана інструктарская група з 30-40 чал.

Для вопыту старастаты будуць таксама арганізаваны і ў савецкіх установах (ЦРК, Наркамгандалю, Белкаапсаюз і інш.).

Старшыні старастатаў заводаў **«Камукар», імя Варашылава, «Бальшавік», ф-кі «Кастрычнік» і чыгункі** будуць вызвалены ад працы на вытворчасьці 3 дні ў месяц для правядзеньня сваёй работы.

Аўладаць тэхнікай

Прэзыдыум ВСНГ БССР распрацаваў рад канкрэтных мерапрыемстваў для пашырэньня тэхнічных ведаў сярод кіруючага складу прамысловасьці.

Існуючыя курсы чырвоных дырэктароў будуць рэарганізаваны з будучага году ў стацыянарную навучальную ўстанову тыпу прамакадэміі.

Для ўзмацненьня тэхнічнага кіраўніцтва аб'яднаньнямі пры ВСНГБ арганізуецца інструктарская інструктарская група.

Аддзел кадраў ВСНГ заключыў умову з дзяржаўнай бібліятэкай аб арганізацыі пры бібліятэцы аддзелу тэхнікі, чытальні і кансультацыі, а таксама перасовачную бібліятэку з тэхнічнай літаратурай для прадпрыемстваў.

Для шырокай прапаганды тэхнічных ведаў, у Менску **будзе арганізаваны клюб гаспадарнікаў.**

Пастаноўлена разгарнуць сетку завочнага тэхнічнага навучаньня па падрыхтоўцы інжынераў-тэхнікаў і кваліфікаваных рабочых.

Усебеларуская сцэнарная нарада

6-га сакавіка ў Доме Пісьменьніка адкрываецца першая ўсебеларуская сцэнарная нарада.

Нарада ставіць сваёй мэтай мабілізацыю ўвагі пралетарскай грамадзкасьці вакол пытаньняў разьвіцьця беларускай кінематаграфіі, пастаноўку пытаньняў аб падрыхтоўцы новых сцэнарных кадраў з асноўных нацыянальнасьцяй БССР, а асабліва пісьменьнікаў і драматургаў, рабкоркораў аб'яднаньняў і літаратурных гурткоў на фабрыках і заводах; прыцягненьне рабочых - ударнікаў на літаратурную работу ў кіно.

Нараде павінна прыцягнуць да сябе ўвагу партыйных, грамадзкіх і літаратурных арганізацый БССР і павінна быць забясьпечана актыўным удзелам і ўплывам пралетарскага літаратурнага руху БССР.

На парадку дня нарады даклады: рэканструкцыя савецкага кіно і пэрспэктывы разьвіцьця беларускай савецкай кінематаграфіі (т. Раманчук); уцягненьне беларускіх пісьменьнікаў і рабкораў на сцэнарную работу ў кіно і кадры (т. т. Брадзянскі і Александровіч); вытворча-тэматычны плян Белдзяржкіно на 1931 год і спосабы яго рэалізацыі (тав. Цывунчык).

На нараду прыбудуць прадстаўнікі аб'яднаньняў сцэнарыстаў з Ленінграду, Масквы, Харкава і Тыфлісу.

Нарада працягнецца тры дні.

На забойства актывіст-калгасьніка — расстрэл

КАПЫЛЬ. Выязная сэсія Вярхоўнага суда разгледзела справу аб зьверскім забойстве кулакамі Зайковічамі Ануфрыем і Алесем актывіста-калгасьніка калгасу «Хваля Рэвалюцыі» (Брачкаўскі сельсавет) — **Залужнага Алеся.**

Тав. **Залужны**—сын бедняка, разам са сваім бацькам былі першымі пачынальнікамі арганізацыі калгасу і лепшымі калгасьнікамі.

Кулакі Зайковічы парашылі ва што-б там ні стала разбурыць калгас. Яны вырашавалі аднаму калгасьніку 50 руб. золатам, каб апошні падпаліў калгас. Калі-ж готы манэўр ім ня ўдаўся, яны парашылі забіць лепшых калгасьнікаў—Залужнага Алеся і яго бацьку, што павінна было выклікаць разбурэньне калгасу. Зайковічы пасьпелі зьверскі забіць аднаго Алеся Залужнага, а бацька апошняга пасьпеў вырвацца з рук забойцаў.

У адказ на забойства Алеся Залужнага 20 гаспадарак беднякоў і сераднякоў-адказасобнікаў уступілі ў калгас «Хваля Рэвалюцыі».

За ходам працэсу над забойцамі-кулакамі сачылі ўсе калгасьнікі-і аднаасобнікі Капыльшчыны. На радзе сходаў былі вынесены патрабаваньні аб пакараньні кулакоў-забойцаў вышэйшай мерай сацыяльнай абароны. Суд прыгаварыў Зайкевічаў да расстрэлу. Прыгавар быў спатканы бурнымі воплескамі ўсіх прысутных у залі.

Клюйко і Фрыд.

Напярэдадні 8 сакавіка

Работніцы—вышэйшую кваліфікацыю

Сьвяткаваньне Міжнароднага камуністычнага жаночага дня ў гэтым годзе адбываецца ў абставінах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце. У бягучым годзе павінна быць завершана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Гэта задача вымагае ад нас максымальна ўцягнуць працоўныя масы жанчын у прамысловасьць, у разгортваньне калектывізацыі і сельскай гаспадаркі. Наша прамысловасьць у сувязі з яе шпаркім ростам адчувае вялікі недахоп у рабочай сіле. Таму нам трэба рыняць усе меры для таго, каб правільна скарыстаць жаночую сілу ў прамысловасьці, паставіць лепш падрыхтоўку кадраў, кваліфікаваных работнікаў з мас лепшых работніц.

У гэтых адносінах за апошнія гады мы маем досыць вялікія посьпехі. Аб іх выразна гавораць лічбы. У 1929 годзе ў прамысловасьці БССР было занята 11.465 работніц, у 1930 годзе гэта лічба вырастае да 15.355 работніц, ня ўключаючы сэзоньніц, што працавалі на будаўніцтве і торфараспрацоўках. У бягучым-жа 1931 годзе ў прамысловасьць ВСНГБ мяркуецца ўцягнуць 22.229 работніц.

Асабліва слаба стаіць справа з укараненьнем жаночай рабочай сілы ў металёвую прамысловасьць. Там у 1930 годзе сярод агульнага ліку рабочых, жанчыны-работніцы складалі толькі 7,3 проц.

Вельмі костра стаіць пытаньне з падрыхтоўкай кваліфікаванай рабочай жаночай сілы ў прамысловасьці. Асобныя гаспадарнікі часамі недаацэньваюць значэньня гэтай справы. Досыць паказаць на тое, што ў прафтэхнічных школах сярод агульнай колькасьці вучняў жанчыны складаюць толькі 16 проц. Такое-ж прыблізна становішча мы маем і па лініі падрыхтоўкі кваліфікаванай жаночай рабочай сілы і на прадпрыемствах. У 1930 годзе толькі 410 работніц прадавалі на рабоце вышэйшай кваліфікацыі, 5.073 на сярэдняй кваліфікацыі і астатнія па нижэйшай. Лепш справа стаіць з падрыхтоўкай жаночай рабочай сілы па лініі ФЗВ. Там жанчыны ў 1930 годзе да агульнай колькасьці вучняў складалі 45,6 проц. Лютаўскі набор у ФЗВ павінен даць каля 54 проц. жанчын.

Масавае ўцягненьне жанчын ў прамысловасьць высоўвае перад намі задачу забясьпечыць іх бытавым абслугоўваньнем, стварыць спрыяючыя ўмовы для іх ўдарнай работы на прадпрыемстве для ўдзелу ў грамадзкай рабоце. Для гэтай мэты па лініі ВСНГ адпускаецца ў бягучым годзе 250 тысяч рублёў на пабудову і пашырэньне ясьлей, асабліва на тых прадпрыемствах, дзе шмат работніц. Аднак, гэтай сумай мы бязумоўна на зможам забясьпечыць тых вялікіх запатрабаваньняў, якія дыктуюцца задачай ўкараненьня жаночай рабочай сілы ў прамысловасьць. Органы аховы здароўя, Наркамасьветы, каапэрацыя і ўсе грамадзкія арганізацыі павінны ўсе сілы накіраваць на тое, каб ўсямерна салдзейнічаць справе бытавога абслугоўваньня работніц, якія ўсё больш і больш ўліваюцца ў прамысловасьць. Культурна-бытавы паход, які праводзіцца ЦСПСБ павінен мабілізаваць усю грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня, праверыць гатоўнасьць прадпрыемстваў, гаспадарчых, каапэрацыйных і прафсаюзных арганізацый для забесьпячэньня і абслугоўваньня бытавымі ўстановамі работніц.

Правільная пастаноўка работы, масавае ўцягненьне ў яе шырокіх пластоў рабочых і работніц зьяўляецца лепшай зарукай таму, што пад кіраўніцтвам партыі мы выканаем задачы, пастаўленыя рэканструкцыйным пэрыядам па ўцягненьні мас працоўных жанчын у прамысловасьць.

Г. РОДМАН.

Ударная брыгада работніц шчотачнай ф-кі імя 8-га сакавіка.

Напярэдадні 8 сакавіка

Гэтымі днямі адбыўся сход дэлегатак **1-га дэлегацкага пункту** Менску. На сходзе быў заслуханы даклад аб падрыхтоўцы да 8-га сакавіка.

Сход пастанавіў **узяць шэфства над адным** з прытарадных калгасаў. Арганізаваны 2 брыгады ў складзе 12 дэлегатак для дапамогі прыгарадным калгасам у правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Створана таксама брыгада жонак рабочых для дапамогі прадпрыемствам у выкананьні прамфінпляну. На гаспаборніцтва выкліканы **другі** дэлегацкі пункт.

Сход пастанавіў прагесьці збор сродкаў на дапамогу беспрацоўным у капіталістычных краінах.

ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ НАПЯРЭДАДНІ РАЗВЕДУ

Дырэктывы партыі аб разгортваньні палітычна-масавай работы сярод працоўных жанчын не знайшлі свайго практычнага праламленьня ў рабоце ЧЭРЫКАЎСКАЙ партарганізацыі. Рад ячэек груба ігнаруюць, апартуністычна недаацэньваюць работы сярод жанчын, кіраўніцтва работай дэлегацкіх сходаў.

РЭЧЫЦКАЯ, ГОРКАЎСКАЯ, ПІЛЬНЯНСКАЯ І ЖУРАВЕЛЬСКАЯ парт'ячэйкі за досыць доўгі пэрыяд, які прайшоў з часу перавыбараў дэлегацкіх сходаў, нічога не зрабілі для разгортваньня іх работы.

Дэлегаткі не прымацаваны да адпаведных савецкіх, каапэрацыйных і гаспадарчых установаў. Ні адна з дэлегатак ня ўцягнута ў школы малапісьменных і лікпункты. Гаспадарчыя і палітычныя кампаніі праходзяць бяз удзелу дэлегацкіх сходаў. У часе перавыбараў с[illegible]ватаў Рэчыцкая і Горкаўская парт'ячэйкі нават не палічылі патрэбным склікаць дэлегатак і абмеркаваць з імі пытаньне перавыбараў.

Дэлегацкія сходы напярэдадні разведу. Райком партыі павінен ўдарыць па апартуністах, якія ігнаруюць важнейшыя дырэктывы партыі і ня ўмеюць ці ня хочуць скарыстаць актыўнас[illegible] жанчын для выкананьня задач партыі на вёсцы.

П.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— **ЦСПСБ.** У 19 гадз. у масавым сэктары ЦСПСБ (пакой № 11) адбудзецца пасяджэньне штабу па правядзеньні бытавога паходу і Міжнароднага дня работніц 8-га сакавіка. Павінны зьявіцца т. т. Юшкевіч—ЦВК, Бухава—РСІ, Рэдман—ВСНГ, Гольдвасэр — БЖС, Юдашкіна—НКЗ, Гуцэнкава—БКС, Слонімская — НКАсьветы, Лібензон —ЦК КП(б)Б, прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ, НК Працы і чыгункі і для дакладу аб рабоце на правядзеньні бытавога паходу прадстаўн. ад саюзу хэмікаў, ЦК саюзу СГРабоч., фабзаўкомаў: з-ду «Бальшавік», фабр. «Кастрычнік» і шчотачнай фабрыкі.

— **Бюро скаргаў.** У 18 з пал. гадз. у памяшканьні ЦКК-РСІ (Савецкая, 55, другі паверх, пакой № 9) адбудзецца нарада рабочых заседацеляў пры Бюро Скаргаў НК-РСІ па пытаньні аб справаздачы працы Б. Скаргаў за асобны квартал. Яўка усіх заседацеляў абавязкова.

— **Гарком ЛКСМБ.** У 19 гадз.—пасяджэньне гарадзкога штабу «Л. К.» гор. Менску. На пасяджэньне павінны зьявіцца наступныя т. т.: Фрыдман, Кучараў, Мітэльман, Кузьнец, Амбражэвіч, Русак, Чарняк, Сідляро, Ляньчук, Зільбэрг, Лапатухін, Маршак, Крэўскі, Радкевіч, Мілюкоўскі, Рыбакоў, Грынбэрг, Сінкевіч, Кузьміч, Гінзбург. Паказаныя т. т. вызваляюцца ад камсамольскіх сходаў. Яўка абавязковая.

— **Тубдыспансэр.** У 19 гадз.—напярэдадні пленуму савету сацыяльнай дапамогі сумесна са старшынямі ФЗМК і сэктарамі аховы працы.

Адказны рэдактар
С. БУРОЧКІН.

АНОНС!

НА ТЫМ БАКУ

Сёньня, о 6 САКАВІКА ДЛЯ ЗАВОДУ „ЭНЭРГІЯ" Пач. а 9 гадз.
Беларускі дзяржаўны тэатр В. Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
Пьеса ў 5 дзеях. 12 абразох.

Кіно-тэатр „Культура"
Новы савецкі фільм вытворчасьці Дзяржкін. рэж. Груэй
ВЕЛЬМІ ПРОСТА
драма ў 6 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гастр. муз. сатыр. Гарына і Славянскага (БІМ-БОМ)
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

ЗЬКАЕЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Новы амэрыканскі прыгодны фільм
У СЬЛЕД
Звыш праграмы кіно-хроніка Савэкіно № 4.
Пач.—у 6 г., 7 г. 30 м., 9 і 10 г. 30 м.
Каса з 4 з пал. гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Сав. фільм вытв. „Межрабпомфільм"
Дзяўчынка со скрынкай
камэдыя ў 6 част.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ політасьветфільм МАРОЗАМ.
Пач. 1 сэансу у 6 г.—Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО „Галістры"
Сав. фільм вытв. „Межрабпомфільм"
БЕЛЫ АРОЛ драма ў 6 част.
ЗВЫШ ПРАГР.—політасьветфільм Чырвоная калёска.
Пачат. ў 6 г., 7 г. 30 м. 9 г. і 10 г. 30 м.
Каса адкрыта—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
2 фільмы ў адзін сэанс
1) ПАХОД КРАСІНА ў 6 частках.
2) Піянэрскі паход Культурфільм у 1 частцы.
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня
Каса—з 12 гадз.

КІНО „СПАРТАК"
2-гі тыдзень нашумеўш. фільм НАПОЛЕОН-ГАЗ
у 7 частках.
Пачатак у 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м.
КАСА з—5 гадз.

У суботу 7 і нядзелю 8 сакавіка 1931 г.
Штодзен. 2 сэансы | У КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" | Штодзен. 2 сэансы
ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ
Кожны дарослы мае права прывесьці з сабой дармова адно дзіцё да 10 год або дзесяцёх прыходзяць паадным білеце.
ВЫКЛЮЧНА ЦІКАВАЯ ПРАГРАМА АМЭРЫКАНСКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ
1) БІЗУН НАГЛЯДЧЫКА (Прыгоды на Канадзкіх лесараспрацоўках) Драма ў 5 частках.
2) ВЯДОМЫ АМЭРЫКАНСКІ КОМІК Гарольд Лёйд у лепшай камэдыі у 5 частках МАРАК
3) ЗВЫШ ПРАГРАМЫ вядомыя музычныя сатырыкі БІМ-БОМ (Гарын і Славянскі).
Карціны ілюструюцца струнным аркестрам у поўным складзе.
Пачатак 1-га сэансу ў 1 г. дня. 2-га—у 3 гадз. дня.
КАСА АДКРЫТА 7 І 8 САКАВІКА АД 11 ГАДЗ. РАНІЦЫ ДА 3 ГАДЗ. ДНЯ.

8 сакавіка, у 6 з пал. гадз. веч., у пяньш. клюбу харчавіковуй адбудзецца
ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ пленуму Менгаркому КП(б)Б, сумесна з ЦСПСБ, прысьвечанае Міжнароднаму камуністычнаму дню работніц—8 сакавіка.
Члены і кандыдаты гаркому, ЦСПСБ і гарсавету праходзяць па сваіх мандатах.
На пленум запрашаюцца дэлегаткі і актыў г. Менску.
Сакратарэм партколектыву і ячэек КП (б)Б прапануецца арганізаць білеты ў гаркоме КП(б)Б, пачынаючы 5 сакавіка (пакой № 10 з 10 гадз. ран. да 4 гадз. дня.
Менгарком КП(б)Б і ЦСПСБ.

МАСКОЎСКАЕ РАЁННАЕ геолёга-разьведачнае КІРАЎНІЦТВА
абвяшчае, што на падставе загаду ВСНГ СССР № 215-1 ад 12-X-1930 г. і загаду галоўнага геолёга-разьведчага кіраўніцтва № 637 ад 31-XII-1930 г.
АРГАНІЗАВАНЫ:
1. Раённая камісія па прэміяваньні за адкрыцьцё месцанараджэньняў карысных выкапняў, якія могуць мець вытворча-гаспадарчае значэньне, і за сдзейнасьць іх выяўленьню.
Адрас: Москва, Котельницкая набережная, д. № 17, 1 под. райсп. Геолкомуправленьне.
2. Мясцовая камісія па прэміяваньні пры Тульскай геолёга-разьведачнай базе Н.РГРК.
Адрас: „ст. Щекино, М. з. д., село Костомарово, Тульская геол. разведочная база".
На падставе палажэньня „аб парадку прэміяваньня працоўных за выяўленьне месцанараджэньняў і іх сдзейнасьць іх выяўленьню" камісіі прымаюць для разгляду і ацэнкі заявы, што датычаць выяўленьня новых месцанараджэньняў карысных выкапняў на тэрыторыі Маскоўскай, Івана-Аўскай, Заходняй вобласьці, Беларускай ССР і Крымскай АССР, аб арганізацыі новых мясцовых камісій будзе абвешчана асобна.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕННЫ РАБФАК пры ветінстытуце
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на 1-шы і 3-ці курсы па 30 асоб.
Прыём заяў да 20 сакавіка.
Іспыты адбудуцца 25 і 26 сакавіка. Пачатак заняткаў—1-е красавіка.
Прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі.
На 1-шы курс патрэбны ведаў у абъёме 4-х трох сямігодак, а на 3-ці курс—у абъёме поўнай сямігодкі. Прыёмныя іспыты праходзяць усе паступаючыя.
Дакументы, патрэбныя згодна дакладнага НКА на 1930-31 навучальны год, дасылаюцца ў канцылярыю рабфаку—Віцебск, Валадарскага, 72-17.
Кандыдаты ад НКА не патрэбны, а патрэбна характарыстыка ад мясцовых арганізацый.
Студэнты рабфаку забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

СЁНЬНЯ, о 6 з пал. гадз. веч., у Доме Працоўных Саюзаў
ГРАМАДЗКІ ПРАГЛЯД ПРАЦЫ ЯУСЭКТАРУ БАН
ДАКЛАДЫ: 1) Тав. Агульны аб дзейнасьці яусэктару. 2) Даклад брыгады аб дзейнасьці асобных працаўнікоў і аналіз іх літаратурнай прадукцыі.
Запрашаюцца рабочыя прадпрыемстваў гор. Менску,—студэнты БДУ, рабфаку, ягпадтэхнікуму і настаўніцтва гор. Менску.
Камісія па праверцы і чыстцы апарату БАН.

СЁНЬНЯ, у 7 гадзін вечара ў клюбе „МАДПРАЦАЎНІК" склікаецца
сход аптэчных працаўнікоў
сумесна з рабочымі брыгадамі і рабочымі з прадпрыемстваў па чыстцы апарату Белавтакіраўніцтва.
У парадку дня: справаздача аб дзейнасьці Белавтакіраўніцтва.
Камісія ЦКК РСІ па чыстцы апарату Белавтакіраўніцтва

Усім фабзаўмясцкомам і калгбюро прадпрыемстваў.
Праўленьне МЦРК паведамляе, што
для прэміяваньня лепшых ударніц да дня 8 сакавіка
вызначан
спэцыяльны фонд
Для таго, каб больш поўна ахапіць прэміраваньнем ударніц, просьба за усіх фабзаўмясцкомаў прадпрыемстваў
сёньня-ж падаць сьпісы жанчын-ударніц
Здаваць сьпісы трэба ў арганізацыі сэктар 6-III-31 г. з 9 гадз. ран. да 4 гадз. дня і з 7 да 9 гадз. веч. (Савецкая, 43, 3-ці паверх, пакой № 4).
Праўленьне МЦРК.

Беларускай канторы „САЮЗХЛЕБ"
ПАТРАБУЮЦЦА БУХГАЛЬТАРЫ І ПАМБУХІ
НА ВЯЧЭРНЮЮ РАБОТУ.
Аплата па згодзе.
Зварачацца да галоўбуха па тэл. 3-17, або па адрасе. Біржовы завулак, 1.
Бел. кантора «Саюзхлеб».

Сёньня Менскім падпісчыкам газэты „Зьвязда" дасылаецца дадатак—
Рэзалюцыі апошняга пленуму Менгаркому КП(б)Б

СЁНЬНЯ, у 6 гадзін. веч., у Доме пісьменьніка адбудзецца
першая ўсебеларуская сцэнарная нарада
ПАРАДАК ДНЯ:
1.